Пралетары усіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВАЗДА

№ 198 (3306) Субота, 31-га жніўня 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII

Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—781

ГААГА, 30. Прадстаўнікамі Англіі, Францыі, Бэльгіі, Японіі, Італіі і Нямеччыны падпісана згода аб спыненьні акупацыі Рэйнскай вобласьці. Англія, Францыя і Бэльгія паведамілі ў пісьмовай форме нямецкую дэлегацыю аб тэрмінах спыненьня акупацыі.

У ГАДЗ. НОЧЫ:

АПОШНІЯ НАВІНЫ Б. С. С. Р.

ВІЦЕБСК, 29. (Ад нашага карэсп.). У памяць тав. Фабрыцыуса, які быў начальнікам віцебскага гарнізону, камандзірам Н-га корпусу, ініцыятыўная група віцебскі камсамольцаў вайскова служачых № артдывізыёну і сутава-рыскай ячэйкі саўгандальслужачых паклала пачатак пабудовы самалёту імя тав. Фабрыцыуса, абвясьціўшы збор сродкаў на самалет

Тварам да раёну

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б па дакладу сакратара Тураўскай (Мазырскае акругі) райпартарганізацыі, якую мы сёньня друкуем у нашай газэце, заслугоўвае пільнае ўвагі з боку ўсіх арганізацый КП(б)Б.

Работу райкому (мінулага складу) ЦК ПРЫЗНАЎ ЗУСІМ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧАЙ, як таксама ЗУСІМ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫМ ПРЫЗНАНА КІРАЎНІЦТВА гэтай арганізацыяй з боку Мазырскага акруговага камітэту партыі.

У гэтым ПРЫГРАНІЧНЫМ РАЁНЕ, г. зн. раёне, у якім асабліва патрэбна выразнасьць і клясавая вытрыманасьць ва ўсіх галінах работы, апошняя ня толькі кульгала на абедзьве нагі, але ва многіх выпадках проста адсутнічала, ня было ніякай работы.

Зразумела, такое становішча магло здарыцца з цэлай раённай арганізацыяй толькі дзякуючы зусім выключнай няўважлівасьці АК да гэтага прыгранічнага раёну. Сувязь Мазырскага АК з Тураўскай арганізацыяй абмяжоўвалася амаль выключна папярова-фармальным кіраўніцтвам.

Вынікі такога кіраўніцтва і такой сувязі зараз-жа выявіліся.

Аказваецца, у Тураўскім раёне няма ніводнага калгасу і да апошняга часу не вялося ніякай работы ў гэтым напрамку. Сярод работнікаў раёну да апошняга часу панавала «тэорыя», што, моў, у нас, у Тураўскім раёне, будаўніцтва калгасаў разьвівацца ня можа. Гэтае чыста правае скажэньне не знаходзіла належнага адпору з боку РК. Дзякуючы гэтаму, пры зямляўпарадкаваньні (дарэчы сказаць, у раёне зямляўпарадкавана ўсяго толькі 18 проц.) арганізоўваліся зусім дробныя пасёлкі—3—4 двары. Зусім невыстарчальна была работа з вясковай беднатой, якая (работа) насіла выключна кампанейскі характар, праводзілася ад выпадку да выпадку. У раёне ня было нават падліку батракоў. Работа з бядняцка-сераднякцкім актывам вёскі таксама адсутнічала.

Вынікам такога становішча быў цэлы рад скажэньняў клясавай лініі ў рабоце. Так, мы наглядаем, што, ня гледзячы на досыць значныя сродкі, укладзеныя ў сельскую гаспадарку раёну, эфэкт гэтых укладаньняў надзвычайна мізэрны. Скарыстаньне крэдытаў у даволі знычным разьмеры (5,2 проц.) ішло за кошт заможнага сялянства. Шырока было распаўсюджана (да 50 проц.) таксама скарыстаньне крэдытаў не па прызначэньні.

Такое становішча з гаспадарчай лініяй арганізацыі не магло не адбіцца на росьце апошняй за кошт батрацтва і беднаты. Рост за кошт гэтых апошніх адсутнічаў, а агульны рост арганізацыі быў надзвычайна слабым.

Такое становішча ў Тураўскім прыгранічным раёне.

Адносна работы ў прыгранічных раёнах ЦК КП(б)Б ня раз даваў мясцом вычарпальныя паказаньні і дырэктывы. Відавочна, што ў Тураўскім раёне мы маем выключна безадказныя адносіны да гэтых, у цяперашніх умовах першачарговай важнасьці, паказаньняў ЦК.

Акруговым камітэтам партыі трэба тэрмінова праверыць, як выкананы гэтыя дырэктывы ў іх раёнах. Такога становішча, як у Тураво, партыя ні дня ня можа цярпець. Відавочна таксама, што, паколькі Тураўскі прыклад выяўляе нам надзвычайна слабое кіраўніцтва АК сваім раёнам, пастолькі паўстае пытаньне наогул аб узмацненьні нашае ўвагі да раёну. Раён—гэта асноўнае зьвяно ў нашай рабоце па сацыялістычным перабудаваньні вёскі. І гэтаму зьвяну павінна быць забясьпечана належная ўвага нашых акруговых арганізацый. Можна сказаць больш: акруговая работа павінна расцэньвацца па стане раёнаў.

ТВАРАМ ДА РАЁНУ—такі лёзунг дня, які дапаможа партыі пасунуць наперад справу пераводу вёскі на рэйкі калектывізацыі, які забясьпечыць партыі пасьпяховую барацьбу з правымі скажэньнямі, найбольш актуальнымі і небясьпечнымі на вёсцы.

На гаагскай канфэрэнцыі

Пастанова палітычнай камісіі аб эвакуацыі Рэйнскай вобласьці

МАГЧЫМАСЬЦЬ НОВАЙ ГРУПІРОЎКІ ДЗЯРЖАЎ

Калі Францыя абяцае ачысьціць трэцюю зону

ГААГА, 29. Палітычная камісія гаагскай канфэрэнцыі сёньня аднагалосна прыняла пастанову па пытаньні аб эвакуацыі Рэйнскай вобласьці, якая будзе пастаўлена ў суботу на абгаварэньне пленарнага пасяджэньня канфэрэнцыі. Згодна гэтае пастановы, Англія і Бэльгія канчаткова эвакуюць Рэйнскую вобласьць у працягу трох месяцаў, пачынаючы з верасьня. Францыя пазьней усіх эвакуе другую зону—Рэйнскай вобласьці. Што датычыць трэцяй зоны, дык Францыя эвакуе яе ў працягу 8-мі месяцаў пасьля ратыфікацыі пляну Юнга францускім і нямецкім парлямантамі. (ТАСС).

Розны пункт погляду дэлегацый на дасягнутую згоду

ГААГА, 29. Прыняцьце пастановы па пытаньні аб эвакуацыі Рэйнскай вобласьці суправаджалася заявамі лідэраў дэлегацый 6 дзяржаў (Англіі, Францыі, Бэльгіі, Японіі, Італіі і Нямеччыны). Пры гэтым побач з звычайнымі ў такіх выпадках прыемнымі выразамі выявіўся і розны пункт погляду паасобных дэлегацый на дасягнутую згоду.

Гэндэрсон адзначыў, што эвакуацыя павінна адбыцца пасьля ратыфікацыі пляну Юнга без няўгрунтаваных адтэрміновак. Брыян выказаў надзею на хуткае вырашэньне фінансавых пытаньняў і ўмоў эвакуацыі. У процівагу гэтаму Штрэзэман выказаў думку, што эвакуацыя Рэйнскай краіны павінна адбыцца незалежна ад фінансавых перагавораў.

Зьмена франка-ангельскіх адносін

РЫМ, 28. Італьянскі друк з поваду дасягнутай у Гаазе згоды піша: «Здаровы розум перамог. Уступкі, зробленыя ў апошні момант на ініцыятыве Брыяна і Масконі (італьянскі міністар фінансаў) яшчэ раз выявілі прагавітасьць Брытаніі. Мы ня ведаем якая выгада для Англіі ў тым, каб нажываць ворагаў у Эўропе і шукаць зьбліжэньня з ПАЗШ, якія занадта моцныя, поўны жыцьця, багаты, імкнуцца панаваць над сьветам і ня маюць патрэбы ў саюзьніках.

«Джорнале д'Італія піша:

«Споўдэн яшчэ раз давёў, што палітыка кулака гарантуе ўступкі. Англія вярнулася да тыповай для яе палітыкі ізаляцыі ад якіх-небудзь абавязацельстваў і палітыкі доўгіх згод з кантынэнтальнымі дзяржавамі. Зьмена франка-ангельскіх адносін, якія патрабуюць перагляду, закранае ўсю сыстэму палітычных узаемаадносін у Эўропе».

«Пополо д'Італія» піша: «Памерла англа-французская згода, якая павінна была гарантаваць французкую гэгэмонію на кантынэнце і на Міжземным моры. Новая ангельская палітыка можа прымусіць Францыю, Нямеччыну і Італію ўтварыць кантынэнтальны блёк. (ТАСС).

У Аўстрыі рыхтуецца фашысцкі пераварот

Аб'яднаньне сялянскага кулацкага саюзу з фашыстымі

ВЕНА, 29. ЦК Сялянскага саюзу паўднёвай Аўстрыі пастанавіў калектыўна і без якіх-небудзь умоў далучыцца да хэймвэру. Гэта арганізацыя налічвае 100.000 чалавек і знаходзіцца пад кіраўніцтвам хрысьціянска-сацыяльнай партыі. Урадавая «Рэйхс-Пост» ухваляе гэта рашэньне і піша:

«Калі сацыял-дэмакраты зноў будуць перашкаджаць ураду працаваць і спрабуюць паралізаваць дзейнасьць парляманту, дык з парлямантам будзе пакончана. Тады ў зьвязку з новымі выбарамі перад хэймвэрамі паўстане вялікая задача—канчаткова ліквідаваць с.-д. апазыцыю». (ТАСС).

ДА ПРЫЕЗДУ У БССР ДЭЛЕГАЦЫІ ПОЛЬСКІХ РАБОЧЫХ І СЯЛЯН

Па дарозе ў Менск дэлегацыя наведае Асінбуд

Камітэтам па спатканьні дэлегацыі рабочых і сялян Польшчы, Зах. Беларусі і Зах. Украіны атрыманы весткі, што дэлегацыя выказала жаданьне яшчэ па дарозе з Масквы ў Менск наведаць раённую электрастанцыю імя Сталіна (Асінбуд).

На станцыю Ворша выедуць прадстаўнікі камітэту па спатканьні дэлегацыі.

ЗВАРОТ ПОЛЬСКАЙ ДЭЛЕГАЦЫІ Ў МАСКВУ

Прыезд польскай рабоча-сялянскай дэлегацыі з паездкі па СССР у Маскву чакаецца 30-га жніўня.

ПОЛЬСКІ ЎРАД КЛАПАЦІЦЦА АБ АБШАРНІКАХ І КУЛАКАХ

ВАРШАВА, 29. Польскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: «Эканамічная рада польскага ўраду пастанавіла адмяніць з 1-га верасьня мыты на вываз шпаніцы. Адначасова павялічваюцца ўвозныя мыты на жыта і муку да 15½ злотых за 100 кілё. (ТАСС).

ДА КРЫВАВЫХ ПАДЗЕЙ У ПАЛЕСТЫНЕ

Французская буржуазія непакоіцца за Сірыю

2.000 арабаў ідзе на Ерусалім

ПАРЫЖ, 29. Як падае французкі друк, існуе падазрэньне, каб хваляваньні ў Палестыне не перакінуліся ў Сырыю. Французкі ўрад выдаў загад пасласць з Тулона ў Бэйрут два мінаносцы. Браняносец «Лямот Піке» ўжо прыбыў у Бэйрут. Французкія газэты падаюць таксама, што на Ерусалім ідуць 2.000 арабаў, да якіх далучаюцца пілігрымы. (ТАСС).

Турэцкі друк аб падзеях у Ерусаліме

КАНСТАНТЫНОПАЛЬ, 29. Камэнтуючы падзеі ў Палестыне, турэцкі друк прыходзіць да вываду, што яны прадстаўляюць сабой няўхільны вынік імпэрыялістычнай палітыкі Англіі. Па думцы «Джумхурыэт», апошнія падзеі прадстаўляюць сабой пачатак новага народна-рэвалюцыйнага руху ў Азіі. (ТАСС).

Нямецкія чырвоная франтавікі разам з камандзірамі АБВШ у Менску

ПОЎНАЯ ДЭЗАРГАНІЗАЦЫЯ КІРАЎНІЦТВА К.-УСХ. Ч.

Новыя арышты савецкіх грамадзян у Харбіне

ТОКІЕ, 28. З Харбіна падаюць, што 23-га жніўня там арыштавана 180 чалавек. (ТАСС).

***

ШАНХАЙ, 29. Кітайскія крыніцы пацьвярджаюць, што 25-га жніўня савецкія грамадзяне, што знаходзяцца ў Харбінскай турме, прабавалі зрабіць пабег. Аднак, вайсковая варта папярэдзіла пабег, загнаўшы зьняволеных у камэры штыкамі. У зьвязку са спробаю пабегу, зьняволеным забаронены ўсякія спатканьні. (ТАСС).

Наплыў бежанцаў у Харбін

ТОКІЕ, 28. З Харбіна падаюць, што ў зьвязку з трывожным становішчам на граніцы ў Харбін прыбывае маса бежанцаў з усходу і захаду. Гасьцініцы перапоўнены. Цэны на кватэры нячувана ўзьняліся. На вуліцах і вакзалах натоўпы бежанцаў. (ТАСС).

Белагвардзейская сволач заварушылася

НЬЮ-ЁРК, 29. Былы пасланьнік ураду Керанскага ў ПАЗШ Баймецяў выступіў у палітычным інстытуце Вільямс Стоўна з прамовай, у якой заклікаў дзяржавы ўзяць часова ў свае рукі кіраўніцтва К.-Усх. чыг. (ТАСС).

Начны рух на К.-Усх. ч. спынены

ТОКІЕ, 29. З Харбіна паведамляюць аб новых двух крушэньнях на К. Усх. чыг., што тлумачыцца поўнай дэзарганізацыяй мэханізму кіраўніцтва дарогі. Паводле апошніх вестак начны рух цягнікоў на К.-Усх. чыг. спынены. У зьвязку з крушэньнямі, а таксама набегамі хунхузаў, якія затрымліваюць цягнікі і грабяць іх, кітайскае камандваньне аддало загад адпраўляць з кожным цягнікам вайсковую варту. (ТАСС).

На польскіх чыгунках

У 1924 годзе на польскіх чыгунках было 97 выпадкаў крушэньняў цягнікоў, а ў 1925 годзе—102, ці ўзрост на 5,1 проц. У 1926 годзе крушэньняў было 198, у 1927 годзе ўжо 263, у параўнаньні з 1924 годам небясьпека на польскіх чыгунках узрасла на 171,1 проц. У 1928 годзе лічба няшчасных выпадкаў на чыгунцы яшчэ больш узрасла. Гэтыя статыстычныя даныя надта выразна сьведчаць аб стане чыгунак у Польшчы і аб тым, што стан гэты не паляпшаецца, а наадварот пагаршаецца.

НАВІНЫ САВЕЦКАГА ДНЯ

Падпіска на 3-ю пазыку Індустрыялізацыі перавысіла 400 мільён. руб.

МАСКВА, 30. Паводле апошніх даных Наркамфіну СССР, падпіска на трэцюю пазыку індустрыялізацыі перавысіла 400 млн. руб. З іх РСФСР дала звыш 301 млн. руб., УССР—86 млн., БССР—9,1 млн., ЗСФСР—звыш 15 млн. руб., Узьбэкістанская ССР—7,9 млн. руб. і Туркменістанская ССР—1.340 тысяч р. Падпіска па Маскве перавысіла 55 млн. руб. Рабочыя і служачыя Масквы калектыўна падпісаліся на 50,8 млн. руб.

Арганізацыя адзінага навукова-тэхнічнага таварыства

МАСКВА, 29. Прэзыдыум ГУМБІТ прызнаў мэтазгодным арганізацыю адзінага навукова-тэхнічнага таварыства, якое працуе пад кіраўніцтвам УсеЦСПС. Паводле праекту ГУМБІТА, на мясцох павінны быць арганізаваны філіялы таварыства, праца якіх праводзіцца пад кіраўніцтвам саветаў прафсаюзаў. У склад савету таварыства павінны ўваходзіць навуковыя працаўнікі ГУМБІТУ, ВСНГ, Народнага камісарыяту шляхаў зносін, НТУ, Дзяржпляну, Акадэміі навук, Варнітсо, Наркамзему, Наркам. аховы здароўя, ЦБ інжынэрна-тэхнічнай сэкцыі. Пры таварыстве намячаецца арганізаваць сэкатры па асобных навукова-тэхнічных дысцыплінах, на чале з прэзыдыумамі, старшыні якіх уваходзяць у склад савету цэнтральнага таварыства. Членамі таварыства могуць быць ня толькі навуковыя работнікі і інжынэры, але і рабочыя заводаў, фабрык і пабудоў.

Справа аб цкаваньні настаўніц—грамадзкіх працаўніц

ЦЬВЕР, 29. У горадзе Ленінску, Кімрскае акругі, пачалася слуханьнем галосная справа аб цкаваньні дзьвюх настаўніц—грамадзкіх працаўніц. У якасьці грамадзкага абвінаваўцы выступае прадстаўнік маскоўскага губэрскага аддзелу працаўнікоў асьветы т. Васільлеў. Да суду прыцягнута некалькі чалавек на чале з былым сакратаром камячэйкі Наталаўскай воласьці Калобавым і кулаком Дубілавым. Цкаваньне настаўніц было пачата Калобавым, які жадаў дабіцца звальненьня настаўніц з тым, каб на аслабоненае месца пасадзіць сваякоў. Калобаў разам з Дубілавым цкавалі вельмі абдумана. Яны сарвалі школьную выстаўку, распускалі пра настаўніц плёткі і, нарэшце, дабіліся іх звальненьня. Настаўніцам удалося аднавіцца на рабоце.

На судзе з поўнай відавочнасьцю высьветлілася, што настаўніцы сталі ахвярай тэй абстаноўкі, якую стварылі ў Наталаўскай воласьці чужыя савецкай уладзе элемэнты, што перацягнулі часткова, або зусім на свой бок савецкіх і грамадзкіх работнікаў. (ТАСС).

МАНЭЎРЫ ЧАСЬЦЕЙ ЛЕНІНГРАДСКАЕ АКРУГІ

ЛЕНІНГРАД, 29. 27-га жніўня пачаліся манэўры часьцей Ленінградзкае акругі. У першы дзень манэўраў трыма дывізіямі разыграны бой.

Прапанова Нобіле „ленгизу".

ЛЕНІНГРАД 21. «Ленгиз» атрымаў ліст ад былога камандзіра дырыжаблю «Норвэгия» Нобіле, які просіць выдаць у СССР на расійскай мове яго кнігі аб апошнім няўдалым палёце. Нобіле паведамляе, што для гэтай працы ім будзе прадстаўлена многа каштоўнага, яшчэ невядомага да гэтага часу матар'ялу і 150 фатаграфій. Ленгіз выказаў прынцыповую згоду на прапанову Нобіле.

Дэлегацыя французскіх рабочых у Данбасе

РАСТОЎ ДОН, 21. У капальні прыбыла дэлегацыя французкіх рабочых. У клюбе капальні «Пралетарская Дыктатура» адбыўся вечар змычкі рабочых капальні з французкімі таварышамі. Дэлегат тав. Брандт выступіў з прывітальнай прамоваю ад імя рабочых і камуністычнай партыі Францыі.

ЭПІДЭМІЯ БРУШНОГА ТЫФУСУ Ў ВАРШАВЕ

ВАРШАВА, 29. Як падаюць газэты, у Варшаве выбухла эпідэмія брушнога тыфусу. Зарэгістравана ўжо 250 захворваньняў. Эпідэмія можа прыняць яшчэ большыя разьмеры, бо з прычыны недахвату месц у больніцах, тыфозныя знаходзяцца дома. (ТАСС).

Пазыка індустрыялізацыі ў вёску

Праз два дні пачынаецца афіцыйная падпіска на трэцюю пазыку індустрыялізацыі. Папярэдняя падпіска, паводле даных на 28 жніўня, дала 345,3 мільёнаў рублёў, што складае 46,1 проц. кантрольных лічбаў. Хоць фармальна падпіска пачынаецца толькі 1-га верасьня, вынікі папярэднай падпіскі мы ня можам лічыць зусім здавальняючымі. Зусім недапушчальным тэмпам разгортваецца кампанія па рэалізацыі пазыкі ў вёсцы. Так, паводле даных НКФ СССР, на 28-га жніўня ў сельскіх мясцовасьцях сума падпіскі складае 10,7 мільёнаў рублёў, што дае ўсяго 5,4 процантаў ад намечанай да рэалізацыі ў вёсцы агульнай сумы пазыкі. Чым можна тлумачыць такое становішча з падпіскаю на пазыку ў вёсцы? Выключна дрэнная работай на гэтым вучастку ўсіх нашых партыйных, савецкіх і грамадзкіх арганізацый. Абсалютная большасьць карэспандэнцый, якія атрымлівае рэдакцыя, красамоўна сьведчыць за гэта. У некаторых вёсках сялянае самі, па сваёй уласнай ініцыятыве праяўляюць свае адносіны да падзей на К.-У. чыг. падпіскаю на 3-ю пазыку індустрыялізацыі.

Аб тым, які эфэкт дае добра пастаўленая работа мясцовай партыйнай арганізацыі гаворыць **практыка Прылуцкае акругі УССР.** У гэтай акрузе, як паведамляе карэспандэнт «Правды», да актыўнай непасрэднай работы па рэалізацыі пазыкі акруговы камітэт партыі прыцягнуў увесь партыйны, камсамольскі і савецкі актыў. Усе раёны і сёлы былі разьбіты па вучастку. Актывісты сваім прыкладам заражалі другіх. Вялікую дапамогу пры рэалізацыі пазыкі зрабіла настаўніцтва. Пасьпяховай рэалізацыі пазыкі дапамагло таксама спаборніцтва паміж паасобнымі раёнамі і сёламі. Былі арганізаваны выезды камсамольскіх брыгад у паасобныя раёны, паходы пінэраў, якія прад'явілі патрабаваньне да бацькоў прыняць актыны ўдзел у рэалізацыі пазыкі і г. д. У выніку ўсёй гэтай работы Прылуцкая акруга заняла першае месца па рэалізацыі пазыкі ня толькі на Украіне, але і ва ўсім Саюзе.

Што асаблівага зрабілі прылуцкія камуністыя? Яны самі пашлі да селяніна, прыцягнулі да актынай работы ца пазыцы бядняцка-сераднякцкую грамадзкасьць. Карачей кажучы, прылуцкія камуністыя ў кампаніі па рэалізацыі пазыкі ў вёсцы рабілі толькі тое, што павінна рабіць кожная вясковая партыйная арганізацыя ў сваёй штодзённай практычнай дзейнасьці пры правядзеньні тых ці іншых гаспадарча-палітычных кампаній.

Ці шмат у нас такіх раёнаў, якія могуць пахваліцца сваімі дасягненьнямі ў галіне рэалізацыі пазыкі ў вёсцы? Вельмі мала. Іх літаральна можна пералічыць па пальцах. Неабходна дабівацца, каб у бліжэйшы час колькасьць раёнаў, падобных Прылуцкаму, павялічылася.

Работу па рэалізацыі пазыкі трэба праводзіць мэтадамі сацыялістычнага спаборніцтва. Кулацтва дасканала разумее ролю пазыкі індустрыялізацыі ў справе сацыялістычнага наступленьня. Таму так моцна змагаюцца кулакі супроць пазыкі індустрыялізацыі. У адным месцы яны распаўсюджваюць чуткі, што быццам пачалася вайна з Кітаем і аблігацыі страцяць цану, у другім падбухторваюць падкулачнікаў весьці агітацыю супроць пазыкі, у трэцім—палохаюць і г. д.

Адначасова з кампаніяй па падпісцы на 3-ю пазыку індустрыялізацыі, неабходна разгарнуць кампанію сярод трымальнікаў старых пазык (у вёсцы іх каля 8.000.000 чалавек) за трыманьне аблігацый.

Практыку пасылкі рабочых брыгад у падшэфныя вёскі трэба пашырыць. З 750 мільёнаў новага ўкладу на індустрыялізацыю краіны 200 мільёнаў прыпадае на вёску і будуць выдаткаваны на разьвіцьцё сельскае гаспадаркі. Вёска павінна і можа даць гэтыя 200 мільёнаў рублёў. Колькасьць трымальнікаў дзяржаўных пазык у вёсцы павінна быць патроена. І гэта будзе зроблена, калі мясцовыя, партыйныя, савецкія і грамадзкія органы зараз-жа неадкладна вазьмуцца за работу па пазыцы, калі ўся вясковая савецкая грамадзкасьць будзе мабілізавана вакол гэтае справы. Вёска павінна ўнесьці свой уклад у індустрыялізацыю краіны, і яна яго ўнясе. («Правда»).

Аб удзеле саветаў у кампаніі перавыбараў дэлегацкіх сходаў

Усім саветам і выканаўчым камітэтам

Чарговыя перавыбары дэлегацкіх сходаў будуць праходзіць ва ўмовах абвастрэньня клясавай барацьбы, небясьпекі вайны, а таму з боку варожых рабочай клясе і працоўнаму сялянству элемэнтаў будуць спробы, каб дэзарганізаваць гэтую важнейшую палітычную кампанію, накіраваную для ўцягненьня ўсіх працоўных жанчын гораду і вёскі ў актыўнае вырашэньне задач, якія стаяць перад партыяй і савецкай уладай па сацыялістычным будаўніцтве.

Выходзячы з гэтага, саветамі і выканкомамі павінны быць прыняты крокі да таго, каб у гэтую кампанію ўцягнуць усіх працоўных жанчын, у першую чаргу работніц, батрачак і сялянак-бяднячак. Узросшую іх актыўнасьць неабходна накіраваць на вырашэньне асноўных задач савецкае ўлады па ажыцьцяўленьні найхутчэйшага тэмпу індустрыялізацыі краіны і перабудовы сельскае гаспадаркі па шляху калектывізацыі і вытворчага каапэраваньня, разьвіцьця культурнага будаўніцтва для барацьбы з рэшткамі старога быту.

А таму ў сучасную кампанію перавыбараў дэлегацкіх сходаў неабходна падняць новыя пласты, яшчэ ня ўцягнутыя ў практычную работу па сацыялістычным будаўніцтве працоўных жанчын і ўцягнуць іх у практычную работу саветаў.

Нанава абраныя дэлегаткі павінны стаць апорай саветаў у справе разьвіцьця сацыялістычнага будаўніцтва.

Кампанія перавыбараў дэлегацкіх сходаў павінна быць скарыстана для правядзеньня справаздач жанчын-членаў саветаў і практыкантак дэлегатак, якія працуюць у камісіях і сэкцыях саветаў. Таксама гэтую кампанію трэба скарыстаць для справаздач кіраўнікоў устаноў, камісій і сэкцый саветаў аб іх рабоце з дэлегаткамі з тым, каб навакол іх справаздач была разгорнута з боку працоўных мас самая шырокая крытыка.

Асабліва неабходна зьвярнуць увагу на вылучэньне жанчын на кіруючую работу ў саветы і іншыя арганізацыі, дэлегатак работніц, батрачак, бяднячак, дапамагаючы ім у штодзённай працы з боку кіраўнікоў гэтых устаноў і грамадзкіх арганізацый. Неабходна таксама замацаваць сувязь з выпушчанымі дэлегаткамі для далейшага вылучэньня іх на кіруючую работу.

У сувязі з правядзеньнем перавыбараў дэлегацкіх сходаў саветы і выканкомы павінны навакол гэтае кампаніі згуртаваць савецкі жаночы актыў і ўсямерна дапамагчы вёсцы праз арганізацыю пасылкі рабочых брыгад, кіно-перасовак, адчыненьне аднадзённых дзіцячых устаноў, прадастаўленьне памяшканьняў для сходаў, прыняць удзел у падборы кандыдатур у новы склад дэлегацкіх сходаў. Дзеля гэтага саветам і выканкомам патрэбна вылучыць неабходныя сродкі для матар'яльнай дапамогі па ажыцьцяўленьні гэтых мерапрыемстваў.

Неабходна зьвярнуць увагу на ўзмацненьне арганізаванасьці і падняцьце актыўнасьці шырокіх жаночых мас найменшасьцяй, сялянак і асабліва работніц саўгасаў, калгасьніц, батрачак і саматужніц, наблізіўшы да іх выбарчыя вучасткі з мэтай найбольшага прыцягненьня на сходы працоўных жанчын і накіраваньня іх актыўнасьці на барацьбу з кулацкімі і нэпманскімі спробамі дэзарганізаваць гэтую кампанію.

Неабходна прыняць меры да таго, каб нанава абраныя дэлегацкія сходы сапраўды сталі актыўнымі барацьбітамі за сацыялістычную перабудову вёскі і правадзікамі лёзунгаў партыі і савецкай улады аб калектывізацыі і вытворчым каапэраваньні сялянскіх гаспадарак, ліквідацыі няпісьменнасьці і г. д. У першую чаргу павінны быць забясьпечаны тыя галіны, дзе больш ужываецца жаночая праца. Пытаньні каапэраваньня, жывёлагадоўлі, птушніцтва, гароднiцтва, ільнаводзтва і г. д. павінны стаць у цэнтры ўвагі нанава абраных дэлегацкіх сходаў.

У радзе агульных задач дэлегацкім сходам патрэбна прыняць самы жывы ўдзел у пытаньнях хлебазагатовак, падняцьця ўраджайнасьці, пашырэньня пасеўнай плошчы і г. д. Кампанія перавыбараў дэлегацкіх сходаў павінна стаць кампанія агляду работы камісій па паляпшэньні працы, быту працоўных жанчын і бытавых сэкцый саветаў.

Камісіі па паляпшэньні працы і быту працоўных жанчын пры саветах і выканкомах, а таксама і бытавыя сэкцыі саветаў у правядзеньні кампаніі перавыбараў дэлегацкіх сходаў павінны прыняць самы актыўны ўдзел.

У мэтах найбольш пасьпяховага правядзеньня кампаніі перавыбараў дэлегацкіх сходаў, прэзыдыум ЦВК БССР прапануе: саветам і выканкомам паставіць пытаньне аб перавыбарах дэлегацкіх сходаў на пленумах саветаў і выканкомаў, а таксама і бытавыя сэкцыі саветаў у правядзеньні кампаніі перавыбараў дэлегацкіх сходаў павінны прыняць самы актыўны ўдзел.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ЧАРВЯКОЎ.
Час. вып. аб. сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. СТАШЭЎСКІ.

Новая правакацыя фашызму ў Заходняй Беларусі

Паліцыя рыхтуе разгром беларускага рабоча-сялянскага соймовага клюбу

25-га жніўня віленская паліцыя зрабіла налёт на сакратарыят Беларускага Рабоча-Сялянскага соймавага клюбу. Арыштавана 16 чалавек, якія знаходзіліся ў памяшканьні сакратарыяту. Фашысцкая прэса трубіць аб арышце камуністычнай канфэрэнцыі, якая займалася падрыхтоўкаю да МЮД'у.

Ня прыходзіцца доўга разглядаць гэтае паведамленьне, каб пераканацца, што **мы маем справу з новай буйной правакацыяй паліцыі ў адносінах да Бел. Рабоча-Сялянскага соймавага клюбу і кіраўніцтва ТБШ.** Гэты налёт — яшчэ адно зьвяно ў ланцузе рэпрэсій ў адносінах да беларускага нацыянальна-вызваленчага руху, гэта пераход да завяршэньня тэй кампаніі, якую за апошнія месяцы вяла ўся фашысцкая прэса супроць Беларускага Рабоча-Сялянскага соймавага клюбу.

З 1-га мая пачаліся сыстэматычныя напады на дэпутатаў гэтага клюбу фашысцкіх баявых дружын і паліцыі. У часе першамайскай дэманстрацыі, пры выступленьнях на мітынгах у галодным раёне, паліцыя і фашысцкія дружыньнікі страляілі ў дэпутатаў Дварчаніна, Валынца, Грэцкага, Крынчыка і Гаўрыліка А разам з гэтым ва ўсёй фашысцкай прэсе пачалося дзікае цкаваньне гэтых паслоў, дзень у дзень зьяўляліся ў гэтай прэсе паведамленьні аб наладжанай сувязі гэтых паслоў з нелегальнай КПЗБ. Віленская **манархічная газэта «Слова» выступіла з адкрытым патрабаваньнем рашучых мер супроць беларускага нацыянальна - вызваленчага руху, арышту паслоў і ўзмацненьня тэрору.** Уся гэта кампанія фашыстых надзвычайна нагадвае тую кампанію, якая імі вялася перад разгромам Грамады.

Арышты ў Вільні гавораць за тое, што **фашыстыя прыступаюць да рэалізацыі сваіх плянаў, — канчаткова разгрому цэнтральнага кіраўніцтва ТБШ, падрыхтоўваюць разгром Беларускага Рабоча-Сялянскага клюбу і арышт яго дэпутатаў.**

Падрыхтоўчую кампанію да разгрому Беларускага Рабоча - Сялянскага клюбу акупанцкія ўлады пачалі ад вясны гэтага году, калі ў Заходняй Беларусі выявілася нарастаньне рэвалюцыйнае барацьбы рабочае клясы і працоўных мас сялянства. Першамайскія дэманстрацыі ў Вільні, рад шматтысячных мітынгаў у вёсках, вострае выступленьне сялян супроць паліцыі, поўны правал фашысцкае групы Луцкевіча - Астроўскага ў справе заваяваньня Т.Б.Ш. і, нарэшце, баявыя першажнівеньскія выступленьні паказалі, што разгромам Грамады фашызм зусім не задушыў нацыянальна-вызваленчага руху ў ЗБ і не прыдушыў рэвалюцыйнае барацьбы мас. Рост рэвалюцыйнага руху, паражэньне фашыстых і ўзмоцненая падрыхтоўка да імпэрыялістычнае вайны супроць Савецкага Саюзу выклікалі ва ўсёй Заходняй Беларусі новую хвалю фашысцкага тэрору. Пасьля разгрому раду прафсаюзаў, гурткоў і акруговых упраў ТБШ ідзе атака на цэнтральнае кіраўніцтва ТБШ, выбранае на масавым зьезьдзе 19-21 мая г. г., ідзе атака на Беларускі Рабоча-Сялянскі соймавы клюб.

Гэтая атака вядзецца фашызмам **сыстэматычна па ўсёй лініі.** Фашысцкая прэса ўзьнімае выцьцё, нібы дэпутаты Беларускага Рабоча-Сялянскага клюбу вазываюць масы да ўзброеных выступленьняў, агенты дэфэнзывы робяць фальшывыя «абежнікі КПЗБ для паслоў Беларускага Рабоча-Сялянскага клюбу», правакатары складаюць дакуманты пра сувязь гэтага клюбу з нелегальнымі арганізацыямі, а паны Луцкевічы і Астроўскія падрыхтоўваюць глебу, каб пасьля разгрому клюбу і кіраўніцтва ТБШ узяць арганізацыі ТБШ у свае рукі і павесьці на фашысцкія рэйкі. Увесь фашысцкі мэханізм пушчаны ў ход, падзел працы строга захоўваецца.

У сувязі з гэтым агульным плянам новага ўдару па беларускім нацыянальна-вызваленчым руху зусім высьвятляецца сэнс абходнага манэўру фашызму, зробленага ім на інсэніяваным Луцкевічам і Астроўскім зьезьдзе ТБШ. Калі гэты зьезд Луцкевіча і ўсёй яго групы, які падрыхтоўваўся на працягу некалькіх месяцаў пры беспасярэднай дапамозе ўсяго фашысцкага адміністрацыйнага апарату, праваліўся, калі выявілася, што ня гледзячы на ўсю актыўнасьць старост у агітацыі за паездку на зьезд, на гэты зьезд зьявілася ўсяго 2 (!) дэлегаты ад гурткоў ТБШ, фашысцкія ўлады рукамі Луцкевіча зрабілі хітры, абходны манэўр. Зьезд Луцкевіча прызнаў галоўную ўправу ТБШ, якая была выбрана на масавым зьезьдзе ў маі. Луцкевіч пры гэтым дэмагагічна заявіў, што ён ня хоча ўзаемнаю барацьбою ўнутры ТБШ руйнаваць яго, таму ён згодзен перадаць уладу радыкальным элемэнтам, «няхай гэтыя радыкалы пакажуць, што яны змогуць зрабіць і мы потым паглядзім».

Віленскі обэр-шпіён Кіртыкліс і нацыянал-фашысты Луцкевіч гэтым пачалі свой манэўр. Луцкевіч «прызнаў кіраўніцтва ТБШ», а паліцыя ўжо падрыхтавалася да арышту гэтага кіраўніцтва, каб Луцкевіч пасьля мог прыйсьці і сказаць «радыкалы аказаліся нездольнымі кіраваць ТБШ, хаця я ім і не перашкаджаў, яны справакавалі разгром гэтай арганізацыі, неабходна ратаваць ТБШ і я бяруся за гэтую справу». Беларуская нацыянальная фашысцкая газэта «Народ» ад 20 жніўня 29 году цалкам выкрывае пляны Луцкевічаў у часе «прызнаньня» галоўнай управы гаворачы: «паступаючы так (прызнаючы галоўную ўправу **А. З.**) беларускія патрыёты з аднаго боку зьнялі з сябе адказнасьць за далейшую долю таварыства

Рашуча ўдарыць па ідэалегіі і практыках правага ўхілу

Справа Тураўскага райкому гаворыць аб спробах правых апартуністых пад прыкрыцьцём гучных рэзалюцый сарваць ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі

„Умовы нашага раёну ня спрыяюць калектывізацыі"—гэта „філёзофія" тураўскіх кулацкіх абаронцаў павінна атрымаць моцны адпор усёй КП(б)Б

„Лінія" Тураўскага райкому пад прыкрыцьцём алілюйскіх рэзалюцый тварылася правыя справы

Ва ўмовах рэканструкцыйнага перыяду народнай гаспадаркі і напружаных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва насыняюваецьць і якасьць партыйнай работы можа і павінна вымяравацца тымі, наколькі тая ці іншая партыйная арганізацыя змагла адшукаць асноўнае і рашаючае зьвяно ў сваёй рабоце, як насыняова яна вырашае практычнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, як уцягвае ў штодзённую працу пярэдніх масы.

Пастанова сакратарыяту ЦК па дакладу Тураўскага райкому, што публікуецца ў гэтым нумары «Зьвязды», з усёй яскравасьцю падкрэсьлівае ня толькі тое, што арганізацыя не змагла ўхапіцца за асноўнае, на ўмовах свайго раёну, зьвяно работы, але і тое, што на вачох усёй партарганізацыі праводзілася яўна антыпартыйная лінія ў асноўным пытаньні палітыкі партыі на вёсцы, праводзілася лінія супроць калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Прырода апартуністых заключаецца ў тым, каб хаваць свой сапраўдны твар і за ўсялякімі «аговоркамі», матывоўкамі» праводзіць правыя справы.

Тураўскія апартуністы ня супроць калектывізацыі «наогул».

Яны толькі лічаць, «што ў гэтую асеньнюю пасеўную кампанію калгасаў і с.-г. аб'яднаньняў, выходзячы з гістарычных і эканамічных бытавых умоў раёнага раёну, у прыватнасьці малазямельня немагчыма стварыць».

Такая ўстаноўка была дана райкомам у пляне асеньняй пасеўкампаніі гэтага 1929 году.

Можа выпадковая гэта ўстаноўка, можа гэта проста памылка?

Вось другі дакумант—выцінкі веснавой пасеўкампаніі 29 году: «Правядзеньне працы веснавой пасеўкампаніі—гаворыцца ў гэтым дакуманце,—праходзіла пад лозунгам уздыму ўраджайнасьці палёў, падвышэньня прадукцыйнасьці сельскай гаспадаркі ногуп і пашырэньня плошчы яравога кліну».

Як бачыце, чытач, і веснавая пасеўная кампанія пад лёзунгам калектывізацыі ў Тураўскім раёне не праходзіла.

У выцінку гэтай правай палітыкі, мы на сёньняшні дзень ня маем у раёне ніводнага калгасу. Праўда, у раёне ёсьць два калгасы, але ці можна лічыць іх калгасамі, калі ў іх лічыцца ўсяго ня 3 гектары...

Земельныя фонды размеркаваны на кансавай аснове, толькі... выходзячы з інтарэсаў клясавага ворага. Напрыклад, у Ператорускім сельсавеце земельны фонд быў размеркаваны «выключна сярод заможнай часткі, беднята-ж нічога не атрымала.

Тое самае і ў другіх мясцох.

Самае галоўнае—усё гэта рабілася ў той час, калі райком партыі прымаў грамавыя рэзалюцыі супроць правай небясьпекі, за лінію партыі, а ў сваіх справаздачах пісаў, «што работа РК ідзе пад кутом гледжаньня выканаьня дырэктыў партыі аб рэарганізацыі сельскай гаспадаркі, аб разьвіцьці калектывізацыі, вытворчага капэраваньня і г. д.».

Кіруючыя работнікі рэйну ж, у партыйнай, так і ў савецкай галіне лічылі, што ўсё тэза правільна адносна «агульнага становішча», што-ж датычыцца свайго раёну, то яго ўмовы «ня спрыяюць росту капэтывізацыі.

І да апошняга часу, да вымены кіраўніцтва, у раёне ня было рашучага адпору гэтай антыпартыйнай установцы.

Горш за ўсё і тое, што знаходзіліся досыць адважныя працаўнікі і ў акрузе, якія надзвычайна ўпарта даказвалі, што ніякага там правага ўхілу няма, ніякай антыпартыйнай лініі там не вядуць і што адсутнасьць калгасаў, скрыўленьне клясавай лініі гэта ёсьць вынік ні больш ні менш як... спабасьць работы.

Праўда, бюро АК з гэтым незгадзілася, але абаронцы тураўскай «палітыкі» і прыхільнікі замазваньня фактаў знайшліся і ў складзе кіруючых работнікаў акругі.

Цяпер наогул адносна стану арганізацыі. Яна ў сваіх радох налічвае толькі 7 сялян ад сахі. Усе астатнія 74 знаходзяцца на тэй ці іншай службе. За дзевяць месяцаў прынята ў партыю толькі 5 сялян і ніводнага батрака ці сель.-гас. рабочага. Між тым, у раёне шмат батракоў, шмат рабочых, занятых на лесарапрацоўках і сплаве, а росту за кошт іх у арганізацыі няма.

З актывам ніякай работы ня было і наогул пытаньнямі росту амаль ніхто не займаўся.

Работа груп беднаты не пастаўлена так, каб зрабіць беднату сапраўднай клісовай апорай партыі на вёсцы, каб згуртаваць яе вакол партарганізацыі.

У пытаньнях разьвіцьця гаспадаркі раёну няма плянавасьці, няма таго зьвяна, за якое трэба ўхапіцца. Работа ідзе «наогул». Тураўскі раён на ўсіх даных навісе ніць малочна-жывёлагадоўчы трэк, але-ж у гэтым напрыму нічога ня робіцца.

Надавыгадна кепска пастаўлена работа па дасягненьні эфэктыўнасьці ад тых выяўлеч укладаньняў, якія даем у сельскую гаспадарку праз сыстэму сельска-гаспадарчай каапэрацыі.

Райком КП(б)Б, выходзячы з свайх непартыйнай лініі, не клапаціўся, абгаворыць, каб гэтыя сродкі салдзейічалі ў першую чаргу арганізацыі калгасаў, таварыстваў і наогул пашыраліся ў сацыялістычнае сэктар сельскай гаспадаркі. З другога боку, ні была ніякая праверка таго, як скарыстоўваецца крэдыт, у выніку чаго надзвычайна нізкі процант, даходзячы да 50 проц., крэдытных сродкаў скарыстоўваецца не па прызначэньні.

Мала раздаць сялянам грошы. Трэба ведаць ня толькі каму даем (заможнік ні ў якім разе атрымаць ня можа), але пры гэтым ведаць, ці правільна скарыстаны грошы.

Зусім недапушчальна, калі тры асобы атрымалі каля 2.000 руб. з 6 проц. гадавых і палажылі ўкладамі ў гэтую-ж каапэрацыю з 9 проц. гадавых і вось ужо год грошы нікуды не скарыстоўваюцца, а праўленьне таварыства ніякіх мер ня прымала.

Надаўна прайшла чыстка партарганізацыі. Чужыя, тыя, хто скажае лінію партыі, хто разлажэўся, праціўнікі калектывізацыі з партыі выкінуты.

Абноўлена кіраўніцтва як на партыйнай, так і на савецкай лініях.

ЦК КП(б)Б даў ясныя дырэктывы, куды накіраваць галоўную ўвагу арганізацыі.

Трэба спадзявацца, што на аснове ясная і выразная лініі партыі, пры згуртаванасьці арганізацыі і пры пыкроўкім прыцягненьні да выкананьня гэтых дырэктыў актыву батракоў, беднякоў і лепшай часткі серадняка, Тураўская партарганізацыя са сваімі задачамі спраўціцца

Д. ВАЛКОВІЧ.

Старыя заслугі не зьмяншаюць новых памылак

Маскоўскія бальшавікі далі належны адпор правым уклоністым і іх тэарэтыкам

Ячэйкі Маскоўскай партарганізацыі ставяць перад тав. Бухарыным пытаньне:

— адкрыта прызнаць свае апартуністычныя памылкі

X Пленум ВКП ў ліку іншых пастаноў зацьвердзіў пастанову пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб вызваленьні ад работы ў ВКП тав. Бухарына (гл. «Правда» № 191).

У гэтай пастанове X-га пленуму, паміж іншым, гаворыцца:

«Зьяўляючыся цэнтрам прыцягненьня ўсіх правых элементаў у КП, тав. Бухарын і яго група спаў прапаведальнае ўпадніцтва і бязьвер'я ў сілы рабочае клясы ня толькі садзейнічалі ажыцьцяўленьню ўсіх антыленінскіх плыняй, але і вядуць да падрыву бальшавіцкай дысцыпліны».

Усе партыйныя арганізацыі і важнейшыя секцыі КІ, як паведамляла ўжо партыйная прэса, ужо сказалі ўхвалі і поўнасьцю падтрымалі ўсе пастановы X пленуму ВКП.

Зараз пастановы пленуму прапрацоўваюцца на сходах партыйных ячэек.

«Правда» ня ўчарашнім нумары вымясьціла справаздачу аб першых выпіках прапрацоўкі.

Маскоўская арганізацыя бальшавікоў, як і заўсёды, ідзе ў першых радох на папулярызацыі і ажыцьцяўленьні пастановы X-га пленуму ВКП.

Абмяркоўваючы выцінкі пленуму, маскоўскія бальшавікі накіравалі жала бальшавіцкай самакрытыкі на выкрыцьцё правай апартуністычнай ідэалёгіі і не пасцілаў—тав. Бухарына, як цэнтральнай фігуры правага ўхілу.

Справаздача аб сходах ячэек у Маскве, прыведзеная ва ўчарашнім нумары «Праўды», выразна паказвае, як маскоўскія бальшавікі, вытрымаўшы шмат боек з апартуністамі, умеюць крытыкаваць, «ня глядзячы на асобы». Яны стаяць перад арамыі, у прыватнасьці перад тав. Бухарыным, пытаньне бальшавіцкую—адкрыта і шчыра прызнаць перад партыяй свае памылкі, якія ўжо выкрытыя і абвергнуты самім жыцьцём. Гэта досыць яскрава і пераконваюча выкрыта на старонках цэнтральнага органу партыі «Праўды» (гл. артыкул аб памылках Бухарына, «Праўда» № 194).

У барацьбе за ленінскую лінію бальшавікі ня могуць схіляць галаву перад самымі заслужанымі ў мінулым людзьмі. «За старыя заслугі ніяка наклонімся, за новыя апартуністычныя памылкі будзем моцна біць, ня гледзячы на асобы»,—так піша «Правда», выказваючы ў гэтых словах настрої ўсёй партыі і яе перадавой Маскоўскай арганізацыі.

Мы прыводзім кораткa словы з рэзалюцый, ухваленых на радзе ячэек Маскоўскай арганізацыі, надрукаваных ва ўчарашнім нумары «Праўды»:

— Агульны сход ячэйкі рэдакцыі «Праўда» ў адпаведнасьці ўхваленай рэзалюцыі, адобрыўшы ўсе пастановы X пленуму ВКП, выкрывае памылкі тав. Бухарына і, паміж іншым, заўважае:

«Ня гледзячы на тое, што жыцьцё крок за крокам разьбівае дашчэнту ўсімыслічныя прадпасылкі тав. Бухарына, ён не зрабіў ніякіх спроб да прызнаньня сваіх памылак, а наадварот, працягвае барацьбу з ленінскім ЦК... Усім вядомы буйныя заслугі тав. Бухарына, аднак, яны ня прымусяць партыю ліквідаваць барацьбу супроць яго памылковых выступленьняў, якія абараняюць аформленую сыстэму правапартуністычных поглядаў. Без ліквідацыі і няўхільнага выкрыцьця правазьнісіцкіх павыцкіх тав. Бухарына і яго адыадумцаў нямысьлімa пасьпяховае сацыялістычнае будаўніцтва».

Вось бальшавіцкі адказ ячэйкі, з якою тав. Бухарын быў вызнаны на працягу гадоў на сваёй ранейшай рабоце ў «Правде».

Такія-ж аскравы адказы, далёкія ад усякага небальшавіцкага захапленьня аўтарытэтамі, атрымаў тав. Бухарын і ў іншых, маскоўскай арганізацыі.

Ячэйка заводу «Праваднік» на сваім агульным сходзе 28 жніўня аднадушна сказала:

— Ячэйка лічыць патрэбным прапанаваць тав. Бухарыну адмовіцца ад спіс памылковых направільных установак, якія ў сучасны момант цалкам абвергнуты жыцьцём і падведзеньні выпікамі грандыёзнага будаўніцтва першага пяцігодку.

Аналёгічныя рэзалюцыі прынятыя многімі другімі ячэйкамі Маскоўскай арганізацыі.

Так маскоўскія бальшавікі, ідучы ў авангардзе УсеКП(б), даюць узор змаганьня за генэральную ленінскую лінію, ставячы перад прыкмі і іх лідэрам тав. Бухарыным пытаньне—«адкрыта і шчыра прызнаць перад партыяй свае памылкі. У абароне прынцыпаў бальшавізму партыя ня схіліць галавы перад любымі аўтарытэтамі і іх ранейшымі заслугамі».

(Паводле матар'ялаў «Праўды»).

Р. К.

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б па дакладу Тураўскай райпартарганізацыі

Заслухаўшы даклад сакратара Тураўскага райкому т. ЛІСІМЕНКА і суздаклад інструктара ЦК т. ВАЛКОВІЧА, сакратарыят ЦК прызнае: зусім нездавальняючым становішчэм Тураўскай райпартарганізацыі, а таксама зусім нездавальняючай работу райкому мінулага складу і слабое кіраўніцтва работай райкому з боку Мазырскага АК, у выніку чаго:

а) у раёне няма ніводнага калгасу і да апошняга часу не вялася работа ў гэтым напрамку; б) зусім слаба разьвіты прасьцяйшыя вытворчыя аб'яднаньні; в) скрыўленьне клясавай лініі пры разьмеркаваньні зямфондаў (перарэгістрацыі) значны процант крэдытаваньня заможных (5,2); д) адсутнасьць работы з беспартыйным актывам, дзякуючы чаму адсутнічае рост арганізацыі за кошт батракоў і сельска-гаспадарчых рабочых; е) нязгнасьць у арганізацыі хваравітых зьявішч (настрой некаторых членаў партыі супроць калгасаў, выказды і развал калгасаў, агітацыя супроць дзяржпазык і г. д.); ж) зусім неўстарчальная арганізацыя беднаты вакол асноўных пытаньняў (калектывізацыя, каапэраваньне, разьмеркаваньне крэдытаў, інвэнтар, арганізацыя сплаўных і лесарубчых арцеляй) і зусім слабая работа груп беднаты, кепская работа з батрацтвам і адсутнасьць падпіку апошніх.

Гэтыя буйнейшыя недахваты, галоўным чынам, тлумачацца, папершае, тым, што да апошняга часу ў работніку раёну панавала думка, «што ва ўмовах Тураўскага раёну калгасная каапэрацыйная арганізацыя ня можа». Гэта антыпартыйная ўстаноўка да апошняга часу не знайшла разнага адпору з боку РК і ўсёй партарганізацыі і, падругое, ёсьць вялікі недахоп у самой сыстэме работы РК. Ён заключаецца ў тым, што РК цэнтр увагі перапражыў на папярэдае кіраўніцтва і не займаўся праверкай выкананьня сваіх дырэктыў, вывучэньнем і падборам людзей і мала практычна дапамагаў ячэйкам у іх рабоце.

2. Сакратарыят ЦК канстатуе, што АК ня выканаў дырэктывы партыі аб узмацненьні ўвагі пагранічным раёнам, асабліва ў галіне падбору кіруючых работнікаў раёну, узмацненьня тэмпу эмляўпарадкаваньня, жывога кіраўніцтва і, ня гледзячы на тое, што апошнія два гады ў раёне было шмат адмоўных зьявішч, АК ня прыняў належных мер да арганізацыйнага узмацненьня кіраўніцтва і практычнай дапамогі. ЦК паказвае АК на неабходнасьць выкананьня гэтых дырэктыў, асабліва ў сэнсе падбору работнікаў і жывога кіраўніцтва.

3. Улічваючы ўсе гэтыя недахопы, сакратарыят ЦК прапануе РК павесьці рашучую барацьбу з канкрэтнымі прадпасылкамі правага ўхілу і прымірэнчымі адносінамі да яго. Гэту работу праводзіць з тэзіс разьлікам, каб згуртаваць ідэйна і арганізацыйна партарганізацыю на аснове сапраўды шырокага разгортвання самакрытыкі і ўнутрыпартыйнай дэмакратыі і стварэньня ўмоў для ня поўнага адбіцьця ў практычнай рабоце арганізацыі. Згуртаваць вакол партарганізацыі батрацкі, бядняцкі і палову шэрагу серадняцкага актыву ПАД ПУНКТАМ ПОГЛЯДУ ВЫКАНАНЬНЯ ЦЭНТРАЛЬНАЙ І ВАЖНЕЙШАЙ ЗАДАЧЫ ПАРТЫІ НА ВЁСЦЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПЕРАБУДОВЫ СЕЛЬСКАЕ ГАСПАДАРКІ.

4. Зьмест усёй масавай работы партарганізацыі, дэлегацкіх сходаў сялянак, камсамольскіх арганізацый, саветаў, каапэрацыі павінен у першую чаргу вызначаць задачай калектывізацыі і вытворчага каапэраваньня сельскае гаспадаркі.

Для выкананьня гэтай дырэктывы партарганізацыі трэба ўзмацніць кіраўніцтва работай савецкіх, каапэрацыйных і інш. арганізацый (падбор і выпучэньне людзей, праверка выкананьня, акыўленьне масавай работы саветаў, каапэрацыі, КСУ, разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва паміж калгасамі, вёскамі, таварыствамі, пасасобнымі гаспадаркамі, акыўленьне работы камісій пры сельсаветах, асабліва сельска-гаспадарчай, уцягнуўшы ў склад іх калгасьнікаў, а таксама беднякоў і сераднякоў).

5. ЦК адзначае, што матар'ялы абсьледаваньня Тураўскай арганізацыі сьведчаць аб адсутнасьці плянаў гаспадарчага разьвіцьця раёну, у прыватнасьці, да апошняга часу ня вызначан напрамак разьвіцьця сельскае гаспадаркі раёну, а таксама адсутнічае падпік і вывучэньне працэсаў, якія адбываюцца на вёсцы, асабліва ў галіне росту пасасобных сацыяльных груп (дыфэрэнцыяцыі). Таму сакратарыят ЦК прапануе: а) Мазырскаму АК у трохмесячны тэрмін скончыць работу па гаспадарчым раёнаваньні (вызначэньне напрамку разьвіцьця с.-г. раёну); б) РК на падставе агульнага напрамку разьвіцьця с.-г. раёну склаўшы канкрэтныя плыны і на выкананьне іх накіраваць усю ўвагу як партарганізацыі, так і савецкіх, каапэрацыйных і інш. устаноў; в) РК пільна сачыць за працэсамі, якія адбываюцца на вёсцы, сваячасова ўжываць меры як эканамічнага парадку (крэдыт, ільготы, падатак і г. д.), так і накіроўваць у належным напрамку работу.

Канстатаваць надзвычайна марудны тэмп эмляўпарадкаваньня раёну (18 процантаў). Пры правядзеньні эмляўпарадкаваньня былі арганізаваны зусім дробныя пасёлкі (3-4 двары). Сакратарыят ЦК прапануе Мазырскаму АК узмацніць тэмп эмляўпарадкаваньня раёну з тым, каб да восені 1930 году упарадкаваць ня менш 50 проц., прычым галоўную ўвагу партарганізацыі, савецкіх і інш. устаноў накіраваць на арганізацыю буйных калгасаў, таварыстваў і г. д., катэгарычна забараняючы арганізацыю хутароў і дробных пасёлкаў.

6. Ня гледзячы на значную колькасьць сродкаў, якія ўкладаюцца ў сельскую гаспадарку раёну праз сыстэму с.-г. каапэрацыі, надзвычайна нізкачная эфэктыўнасьць ад гэтага ўкладаньня. Гэта тлумачыцца, папершае, тым, што РК і кіраўніцтвы органы не вялі работы, каб гэтыя сродкі ў першую чаргу дапамагалі арганізацыі калгасаў, машынных і інш. таварыстваў, і наогул накіраваць на пашырэньне сацыялістычнага сэктару, і, падругое, значная доля крэдытаў, якая даходзіць да 50 процантаў, скарыстоўваецца не па прызначэньні і ў сельскую гаспадарку не ўкладаецца. ЦК прапануе РК работу с.-г. каапэрацыі будаваць так, каб замацоўваць у першую чаргу разьвіцьцё сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі. Надалёк кантроль і сыстэматычную праверку скарыстаньня крэдытаў, стварэньня вакол гэтага грамадзкую думку, адначасова спыніць крэдытаваньне заможных, якія яшчэ атрымліваюць значную долю крэдыту (5,2 проц.).

7. Адзначаючы зусім слабую арганізаванасьць беднаты і слабы ўдзел груп беднаты ў вырашэньні асноўных пытаньняў палітыкі партыі на вёсцы (калектывізацыя, каапэраваньне), а таксама пытаньняў мясцовага жыцьця, для пераўкаваньня бядняцкага крэдыту; в) праверка накіраванасьці і скарыстаньня с.-г. крэдыту, арганізацыя грамадзкіх заворваньняў, пасеўкампанія, разьмеркаваньне пасеўматэр'ялу і г. д.; г) скліканьне прадстаўнікоў груп беднаты на пазасыдзе раёну; д) практыкаваць скліканьне прадстаўнікоў груп беднаты напярэдадні сходаў, канфэрэнцый, зьездаў і г. д., якія праводзяцца савецкімі і кааперацыйнымі ўстановамі.

Асноўнай установай у рабоце сходаў беднаты павінны быць: вытворчае каапэраваньне, пытаньні калектывізацыі бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак, арганізацыя ўзаемадапамогі, з таксама распраўцоўка і практычнае ажыцьцяўленьне пытаньняў, зьвязаных з правядзеньнем кампаніі.

8. Адсутнасьць росту арганізацыі за кошт батракоў і с.-г. рабочых і зусім слабы рост наогул, адсутнасьць беспартыйнага актыву і работы з ім сьведчыць аб зусім слабой масавай рабоце на вёсцы, слабой сувязі партарганізацыі з масамі. ЦК прапануе РК узмацніць масавую работу на вёсцы, ажыцьцяўляючы дырэктывы ЦК, асабліва ўвагу зьвярнуць на вярбоўку ў партыю батракоў, беднякоў, калгасьнікаў і с.-г. рабочых. Работу груп беднаты паставіць так, каб падрыхтаваць для ўцягненьня ў партыю актывістых беднякоў, батракоў, што праявілі слабе на гэтай работе. З гэтай мэтай партарганізацыям павінна ставіць пытаньні культурнага і гаспадарчага будаўніцтва і расплумачэньне наогул палітыкі партыі на вёсцы, прыцягваць членаў груп беднаты на адкрытыя сходы ячэйкі, уцягваць у палітшколы, розныя гурткі і г. д.

9. З прычыны невыстарчальнай увагі да работы сярод сялянак з боку РК і партарганізацыі і адсутнасьці на працягу году райжанарганізатара, работа сярод сялянак пастаўлена надзвычайна слаба (дрэнна працуюць дэлегацкія сходы, німа выпучаньня жачын-сялянак у савецкія і каапэрацыйныя органы, зусім няма росту арганізацыі за кошт сялянак). Ён прапануе РК узмацніць кіраўніцтва работай сярод сялянак, асабліва ўзмацніць дэлегацкія сходы (падбор кіраўнікоў), уцягнуць сялянак у вырашэньне пытаньняў калектывізацыі, каапэраваньня, а галоўнае больш рашуча выпучаць актывістак-жанчын (бяднячак і батрачак) на работу ў саветы, каапэрацыю і г. д. Зазначыць Мазырскаму АК на недапушчальнасьць таго, каб пагранічны раён на працягу году быў без жанарганізатара.

10. Буйным недахватам у рабоце РК зьяўляецца невыстарчальнае кіраўніцтва камсмолам, у выніку чаго ў камсамольскай арганізацыі ёсьць шмат хваравітых зьявішч (выхад з ЛКСМ цэлай ячэйкі, утойванье аб'ектыў абкладаньня і выступленьне супроць кандыдатуры ячэйкі пры перавыбарах і г. д.). РК трэба ўзмацніць кіраўніцтва камсамолам, вядучы барацьбу з хваравітымі зьявішчамі, зьвярнуць увагу на ўцягненьне ў партыю актывістых-камсамольцаў з беднаты і батракоў, больш прыцягваць камсамольцаў на партсходы, больш ахапіць камсамольскі актыў школамі і гурткамі і г. д., накіроўваючы галоўную ўвагу на больш актыўных удзел камсамолу ў гаспадарчым жыцьці вёскі (калектывізацыя, каапэраваньне, самаабкладаньне і г. д.).

11. У рабоце РК мала месца надаецца ролі мястэчка ў гаспадарчым і палітычным жыцьці раёну і агульны падыход да мястэчковага насельніцтва, што знайшло сваё канкрэтнае прапаноўленьне нават у тым, што РК не разглядаў пляну гаспадарчага ўкладаваньня мястэчка і мала займаўся пытаньнямі паляпшэньня эканамічнага становішча беднаты, дый наогул была дрэнна пастаўлена работа ў мястэчку.

ЦК прапануе райкому павесьці барацьбу з такімі адносінамі да мястэчка, узмацніць работу ў мястэчку як у галіне палітычнай арганізацыі мястэчковай беднаты, так і ў галіне гаспадарчага ўкладаваньня мястэчка.

12. Ня гледзячы на вялікую ролю пясной гаспадаркі ў жыцьці раёну і яе значэньне для БССР (экспарт), партарганізацыя на гэта пытаньне не звярталася пільнай увагі. Слабая работа па арганізацыі лесарубчых і сплаўных арцеляй, зусім адсутнічае масавая работа сярод лесарубаў і сплаўшчыкаў. ЦК прапануе РК забясьпечыць сталую ўвагу партарганізацыі да пытаньняў лесапрацоўкі і сплаву як у галіне гаспадарчага кшыцьця (вызначэньне сабекошту заготовак, арганізацыя арцеляй у першую чаргу з беднякоў, высоўваньне на адміністрацыйную работу беднякоў, батракоў і г. д.), так і ў галіне культурнага абслугоўваньня (газэты, радыё, кіно-перасоўкі і г. д.).

13. Адзначаючы посьпехі ў галіне ліквідацыі аблігасьнасьці (1.000 чал.), сакратарыят ЦК адзначае зусім слабую масавую і палітасьветную работу на вёсцы—хаты-чытальні і г. д. амаль не працуюць, зусім дрэнны падбор кіраўнікоў хатамі-чытальнямі, зусім незадавальночы сацыяльны склад настаўніцтва, сярод якога зусім адсутнічае партыйная і камсамольская праслойка, выходзячы з чаго прапануе НКАсьветы і ЦП саюзу працаўсветы ўжыць тэрміновыя заходы да паляпшэньня стану настаўніцтва раёну. Работа хат-чытальень і наогул уся палітыка-асьветная работа павінна быць падпарадкавана задачам перабудовы сялянскае гаспадаркі на каапэрацыйна - калектыўныя пачаткі, арганізоўваючы праз вясковыя установы (хаты-чытальні, нарадамы, чырвоныя куткі) прапаганду арганізацый калгасаў. Для гэтай мэты выкладзіць выставкі, экскурсіі сялян у саўгасы і калгасы іншых блізкіх раёнаў, даклады, гутаркі і г. д.

14. Мазырскаму АК праз тры месяцы праверыць выкананьне гэтых дырэктыў.

Работа з беднатой-важнейшая задача партарганізацыі вёскі

(Па матар'ялах Грэскага раёну).

Ва ўсёй нашай рабоце на вёсцы работа з беднатой вылучэцца важнейшай галінай.

Там, дзе яна вядзецца слаба, дзе бедная арганізавана вакол партыі за ажыцьцяўленьне партдырэктыў аб перабудове сельскай гаспадаркі на аснове калектывізацыі, там дырэктывы партыі праводзяцца ня тым тэмпам, якім іх трэба праводзіць.

Матар'ялы праверкі Грэскай партарганізацыі, Менскай акругі, з асаблівай яскравасьцю аб гэтым гавораць.

На працягу году на раёне праведзены 323 сходы, в іх па справаздачна-перавыбарчай кампаніі сельсаветаў—158, па правядзеньні самаабкладаньня—89, перавыбараў крэдытнай каапэрацыі—43, перавыбараў спажывецкай каапэрацыі —33 сходы; сходы беднаты па іншых пытаньнях амаль не праводзіліся, ніякага ручэю ў іх вялося ні ячэйкамі, ні РК.

Масавая работа з беднатой праводзіцца толькі ў выязку з кампаніямі.

Пытаньні да сходаў беднаты ў пераважнасьці падрыхтоўваюцца слаба, а то і зусім не падрыхтоўваюцца ячэйкай.

Напрыклад, Гроваўская ячэйка зусім не падрыхтоўвала прапаноў да дакладу КСУ на сходзе беднаты, папат і пасьля дакладу прысутнічалі на сходзе партыйцы, якія не ўзялі на сабе першымі ініцыятывы па ўнясэньні прапаноў па дакладу. Такія няўважлівыя адносіны ячэек да падрыхтоўкі і правядзеньня сходаў беднаты прыводзяць да таго, што сходы часамі не дасягаюць пастаўленай мэты, беднату праз іх не арганізоўваюць вакол мерапрыемстваў партыі, не замацоўваюць бядняцка-серадняцкага блёку супроць кулака. Так, у вёсцы Шышуцы, дзе праводзіцца зямлеўпарадкаваньне, агульны сход сяліян не прыняў пастановы сходу беднаты аб павышэньні мінімальнай зямельнай нормы шляхам вызьнёньня каэфіцыенту, хоць гэта карысна і серадняку. Тут-жа на сходзе кулак Сівец Н. П. імкнуўся ўзваяціць кіраўніцтва сходам, ён вызнаўнуўся да сходу, каб апошні пераглядзеў пропынтае ўжо рашэньне аб расцэнцы якасьці зямлі, якая яму ня была выгодна (на яго складзен пратакол).

Ячэйцы і РК трэба зрабіць з гэтага і другіх фактаў адпаведныя высновы, якія, на жаль, яшчэ ня зроблены.

Трэба рашуча адбіць усялякую ахвоту ў кулацкіх і іншых варожых нам элементаў выступаць супроць нашых мерапрыемстваў. Для гэтага трэба з усёй сурёзнасьцю і адказнасьцю разагрунтаваць на арганізацыі і выкананьні беднаты вакол дырэктыў, грунтуючы ўвагу на практычных пытаньнях жыцьця вёскі і перабудове сельскай гаспадаркі.

Асноўная-ж маса серадняцтва ідзе пад кіраўніцтвам парт'ячэйкі разам з беднатой.

Напрыклад, замаль усе кандыдатуры з уходзіўшых кредытнай і спажывецкай каапэрацыі, якія высоўвалі сходы беднаты і ячэйка КП(б)Б, былі серадняцкімі падтрыманы і праведзены сходамі. Кулацка-заможная частка выступала сваіх кандыдатаў, але ўсе яны прапаліліся, за выключэньнем вышэйпаказаных в. в. Мараазы і Белая Лужа.

Былі выпадкі спроб з боку кулакоў сарваць сходы сялян. Усе кулакі і заможныя дэманстрацыйна підалі сход, але бядняка-серадняцкія масы іх не падтрымалі (в. Сляпен, Серадзкае ведае, з кім яму па дарозе, трэба толькі рашуча ўзмацніць работу па замацаваньні бядняцка-серадняцкага блёку супроць кулака, узмацніўшы наступленьне супроць апошняга на ўсіх галінах будаўніцтва і работы на вёсцы.

Зараз ёсьць на раёне 10 груп, в іх 6 пры сельсаветах, 2 пры спажывецкай і дзьве пры крэдытнай каапэрацыі. Пры КСУ ні адной групы беднаты не арганізавана. Вестні ёсьць толькі аб складзе 6 груп, у якіх ўваходзіць 52 чал. (49 мужчын і 3 жанчыны, з іх камуністых 13, камсамольцаў—2, рабочых—1, беднякоў—30 і сераднякоў—6 (вестні непоўныя).

Як мы бачым, у склад груп уваходзіць 6 беспартыйных сераднякоў, што супярэчыць палажэньню аб группах. Гэта з той мэты, каб у складзе Гроваўскага сельсавету ёсьць работніца, якая у групу чамусьці не ўвайшла.

На працягу году адбылося 24 пасяджэньні, у сярэдніх па 4 пасяджэньні на групу, дзе разгледжаны наступныя пытаньні: аб адтэрміраваньні і выдачы пазык—3, зацьвярджэньне сьпісаў беднаты—1, аб абслугоўваньні беднаты савецкімі і каапэрацыйнымі арганізацыямі—11, разьмеркаваньне лесу—6, аб выкрыцьці аб'ектыў абкладаньня—1, распаўсюджаньне сялянскай пазыкі—3.

Пытаньні, якія разглядаюцца на группах, у пераважнасьці носяць таксама, як і на сходах беднаты, кампаніейскі характар.

Пытаньні агульнага жыцьця вёскі на абгаварваньне груп амаль на выносяцца.

Сакратары парт'ячэек на пасяджэньнях груп ня бываюць, кіраўнікі груп у большасьці да сваіх абавязкаў адносяцца фармальна і нават нядбайна, напрыклад, кіраўнік групы пры Першамайскім сельсавеце т. Ліхоўскі працаў групы ня ідзе, пасяджэньні праходзілі без яго непасрэднага кіраўніцтва.

Група беднаты пры Шышуцкім сельсавеце бярэ на сабе не свае функцыі, бярэцца арганізоўваць свайі сілами паказальны зямельны вучастак. Кіраўніком групы беднаты пры Паліканчэўскім сельсавеце зьяўляецца кандыдат партыі. У кіраўніка групы і на ўсіх сакратара парт'ячэйкі ня было ніякага разуменьня, а каго навіцца складацца група, дзякуючы чаму ў групу ўваходзяць усе члены сельсавету, за выключэньнем заможнікаў, і ўсе батракі—ячэйкі сельсавету.

У большасьці групы беднаты не працуюць, ячэйцы толькі на паперы. У агульнасьці групы і іх працы існуе вялікая блытаніна, жывое праверкі і інструктаваньня на месцы працы з беднатой і асабліва групамі беднаты з боку РК КП(б)Б не рабілася.

З усіх парт'ячэек слухалі даклады аб рабоце групы беднаты толькі бюро Грэскай і Гроваўскай ячэек, прычым бюро Грэскай ячэйкі ніякіх дырэктыў на дадзены з абмяркавалася прыняцьцем «да ведамаў».

І што-ж робіцца сярод с.-г. рабочых і батракоў?

У раёне ёсьць два саўгасы, у якіх працуе каля 100 рабочых. Сувязь апошніх з навкольным сялянствам арганізавана слаба—на сходы беднаты ў бліжэйшыя вёскі рабочыя ня ходзяць. Парт'ячэйкі ня ставяць перад рабочымі пытаньня аб неабходнасьці наведваньня сходаў беднаты і агульных сялянскіх сходаў.

З падзённымі рабочымі—беднатой ніякай палітвыхаваўчай работы не праводзілася.

Культмасавая работа, калі яна некалькі і праводзілася у зімовы час, то ня ўсёй масе. Гэта зусім не праводзіцца, дзякуючы чаму сярод асобных рабочых распаўсюджаны папойкі і карцёжная гульня, рабачкомы і ячэйкі амаль ніякай барацьбы з гэтым зьявішчам не вялі.

Батракоў па раёне ёсьць 534 чал., з іх членаў саюзу—толькі 60, застрахаваных—92, у той час, калі ёсьць заданьне застрахаваць на менш 250 чал. Дагаварэ́ны ахоплена толькі 300 батракоў, прычым, колькі працуе ў кулацкіх гаспадарках—невядома.

Сходы батракоў праводзяцца вельмі рэдка, ніякай культмасавай работы ў іх не праводзіцца, ніводнага гуртка ня існуе. У работу хат-чытальень батракі ўцягваюцца зусім слаба. Ліквіднікамі было ахоплена ў мінулую зіму толькі 18 батракоў, прычым вестак аб ніпісьменных батраках раёне німа. Колькі выпісваецца газэт, ніхто пра гэта ня ведае.

Праверка фактычнага выкананьня дагавораў ніхто не праводзілася. Кіраўніцтва ад ЦП саюзу зусім слабое.

Даклады аб становішчы работы раёнкомам у батрачкомаў парт'ячэйкі не заслухоўвала а таксама райком партыі спецыяльна пытаньне аб рабоце сярод с.-г. лесарабочых ні на бюро, ні на пленуме ня ставіў.

З усяго гэтага мы бачым, што работа сярод важнейшай часткі насельніцтва: беднаты, с.-г. рабочых і батрацтва, на якую на ўсёй рабоце партарганізацыі павінна апіраць, вербаваць з іх вяршыцу ўсяку сваё рады, пастаўлена зусім дрэнна.

Таму і рост партарганізацыі зусім слабы. За год арганізацыя вырасла толькі на 24 чалав., з іх рабочых 12, батракоў толькі два і беднякоў—7 чал.

Гэта ў той час, калі налічваецца ў раёне 100 саўгаскіх рабочых і больш як 600 батракоў, а за наўгодзьдзе батрачага году прынятых у арганізацыю ўсяго толькі 2 таварышы. Агляд і праверка становішча работы, праведзеная акругкомам, і чыстка арганізацыі ад усяго нядобраго выкрылі рэд недахопаў, усе бачлічкі і у некаторай ступені дакамалі іх зьвішчыць і выпрацаваць рад мер па рашучым задаўраўленьні ўсёй работы раёне, у тым ліку і работы з беднатой і батрацтвам.

**Я. КАЗ

Асноўныя задачы другога году пяцігодкі

Савет Народных Камісараў БССР прыняў кантрольныя лічбы на 1929-30 год

ДАКЛАД ДЗЯРЖПЛЯНУ

ВЫНІКІ 1-га ГОДУ ПЯЦІГОДКІ

Рост пасеўнай плошчы

Кантрольныя лічбы на будучы год—кажа дакладчык т. Гальдштэйн—гэта плян гаспадаркі і культуры на другі год пяцігодкі. Гэта адно абавязвае да таго, каб вывяліць, у якім стане знаходзіцца наша гаспадарка пасьля першага году пяцігодкі, як пяцігодка ўлічыла нашы магчымасьці і патрэбнасьці.

Асноўнае пытаньне, гэта пытаньне аб тэмпах. Якіх тэмпаў мы дасягнулі летась? Гэтыя агульныя вынікі за ўвесь год, ня гледзячы на тое, што мы сям-там не дасягнулі намечаных пляноў, сям-там не дасягнулі якасьці ў нашых устаноўках, наогул паказваюць, што тэмпы 5-цігадовага пляну ня толькі ажыцьцяўляюцца, але ў цэлым радзе галін перавышаюцца.

Калі па сельскай гаспадарцы мы атрымалі прырост пасеўных плошчаў не на 3 проц., як было намечана дырэктывамі, а на 2 проц. (згодна папярэдніх даных 10-проц. апытаньня), дык гэта сьведчыць, бадай, аб тым, што мы не скарысталі ўсіх магчымасьцяй, якія нам апарат павінен быў арганізацыйна скарыстаць. Сялянства-ж рэагавала на нашы мерапрыемствы ўздымам пасеўнае плошчы, пры чым гэты ўздымаслівы выражаецца ў галіне тэхнічных культур і траў. Мы маем рост пасеўнай плошчы па ільне на 9,5 проц., мы маем рост па травах на 31 проц. Мы, такім чынам, маем далейшае павялічэньне, тым больш, што ў 1928-29 годзе мы ўвайшлі з ростам плошчы ўсяго на 1 проц. Значыцца, гэты год дае па-зноўе рост больш, чым мінулы год, і па якасьці дае лепшыя паказальнікі, як летась.

Але дзе ў сельскай гаспадарцы трэба сыгналізаваць, дзе мы маем бязмоўна пагоршаньне, прычым гэта пагоршаньне стаіць у простай сувязі з умовамі вытворчасьці папярэдняга году,—гэта ў галіне жывёлагадоўлі. Калі летась мы маглі канстатаваць стабілізацыю па жывёле, дык у гэтым годзе мы павінны канстатаваць агульны ўпадак па жывёле на 3 і больш проц. асобна па буйной рагатай жывёле на 5 і больш процантаў, а па сьвіньях больш, як на 10 проц. Чым гэта тлумачыцца? Мы гэта тлумачым амаль выключна адмоўнымі кармовымі ўмовамі апошніх двух год.

Вялізны тэмп калгаснага руху

Што асабліва трэба выпукліць у адносінах сельскае гаспадаркі за мінулы год,—гэта асаблівы разгон мерапрыемстваў. Як-бы мы не ацэньвалі кампанію бягучага году, якія-б дэфэкты мы не знаходзілі, але веснавая кампанія бягучага году дае значна больш высокі тэмп ажыцьцяўленьня мерапрыемстваў, чым летась. Падам такія паказальнікі: ня гледзячы на тое, што па ляне ня была завезена ўся колькасьць мінэральных угнаеньняў, але тое, што было завезена, складае 200% у адносінах мінулага году, ачыстка насеньня дасягнула 60 проц.

Але самы важны факт гэта тое, што мы ня ўлічылі таго разгону, які агрымаўся ў адносінах калгаснага руху. Усе нашы праектаваньні, якія мы павялічвалі паступова, ужо на весну былі перавышаны. Мы мелі на кастрычнік мінулага году 95 тысяч гэктараў пад калгасамі, мы праектавалі 140 тыс. гэкт., потым 150 тыс. і ўсё-ж мы атрымалі значна больш. Мы лічым, што на 1-е кастрычніка мы будзем мець ня менш 265 тыс. гэкт., г. зн. амаль патраенне леташняе плошчы. Гэта гаворыць за тое, што трэба будзе перагледзець цэлы рад паасобных мерапрыемстваў, нават незалежна ад перагляду самога пляну калгаснага будаўніцтва.



Рост прамысловасьці ў БССР

Работа прамысловасьці

Цяпер пра асноўныя вынікі ў галіне прамысловасьці. Тут трэба правесьці рэзкую мяжу паміж першым і другім паўгодзьдзем бягучага году. За першае паўгодзьдзе колькасна прамысловасьць не разгортвалася адпаведным чынам. Дасягненьняў ня толькі ў галіне колькасных, але і ў галіне якасных паказальнікаў мы мелі вельмі мала па працягу першага паўгодзьдзя: мы ўсяго зьнізілі сабекошт на 2 проц.

Той уздым, які атрымаўся ў рабочых масах у сувязі з правядзеньнем сацыялістычнага спаборніцтва, паказаў, што мы адсталі ў разгортваньні мерапрыемстваў, і калі мы на працягу цэлага году будзем мець тыя ці іншыя становчыя вынікі, дык гэта зьяўляецца вынікам работы пераважна другога паўгодзьдзя. Ужо трэці квартал дае ў адносінах да другога рост прадукцыі адразу на 17 проц. Ліпень гэтага году дае ў адносінах да ліпеня леташняга году прырост прадукцыі на 63 проц.

І калі мы зараз можам гаварыць аб тым, што прамысловасьць выканае праграму амаль поўнасьцю, што тэмп росту па цэнах 1926-27 г. будзе прыкладна на 45 проц., дык гэта таму, што ліпень-жнівень і верасень будуць даваць тэмп у 60 і больш проц. супроць леташняга году. Калі мы зараз гаворым, што сабекошт ня будзе зьнижан да дэкрэтўныя 7 проц., а толькі на 4,5 проц., мы ўлічваем, што першае паўгодзьдзе дало ўсяго 2 проц. зьнижэньня сабекошту; гэта значыць, што ў другім паўгодзьдзі гэта зьніжэньне дасягае прыкладна 6 проц. Толькі пры гэтых умовах мы дасягнем гэтых 4,5 процантаў.

Мы зарплату павялічылі на 11 проц. замест запраектаваных 8 проц. Зарплата выйшла за гэтыя межы, а прадукцыйнасьць працы дасягнула больш 24 проц. супроць намечаных паводле прамфінпляну 26 проц. і 20 проц. па кантрольных лічбах. Была дырэктыва, каб фактычна дабіцца вышэй 20 проц. росту прадукцыйнасьці працы, а мы дабіліся 24 проц.

Трэба падкрэсьліць, што ў бягучым годзе, ня гледзячы на некаторае перавыкананьне па зарплаце, недавыкананьне па прадукцыйнасьці працы, мы ўсё-ж такі маем суадносіны вельмі спрыяючыя: 11 проц. росту па зарплаце і 24 проц. росту прадукцыйнасьці працы—значыць, мы маем у гэтых адносінах спрыяючыя вынікі.

Якія вывады за пятвішні год? Вывады можна зрабіць вось якія, што мы маем недахоп там, дзе слаба разгарнулі работу, што знойдзены дадатковыя рэзервы як тэхнічнага парадку, так і сацыяльнага, што мы маем рост калектывізацыі ў вёсцы, рост прадукцыі ў горадзе, спаборніцтва ў горадзе, цягу бяднякоў-серадняцкага сялянства да падвядзеньня новай базы пад сваю гаспадарку, а адгэтуль і рост пасеўнае плошчы, які мы маем у большым процанце, як летась. Ня гледзячы на цяжкія кармавыя ўмовы і зьмяншэньне жывёлы, перад намі ўсё-ж ёсьць перспектывы досыць шпаркага адваўленьня на новых падставах там, дзе быў правал у бягучым годзе.

Перагледзець пяцігодку ў бок павышэньня

39 млн. руб. на капітальнае будаўніцтва

Агульныя ўкладаньні ў прамысловасьць, якія намячаюцца на будучы год у 49 міл. руб., калі да іх дадаць паасобныя асыгнаваньні па саюзным бюджэце і па электрыфікацыі, дык яны перабольшваюць тыя асноўныя капіталы ўсёй прамысловасьці, якія ў нас былі да пачатку рэканструкцыйнага пэрыяду.

Такім чынам, асноўны капітал прамысловасьці, які яна атрымала ў выніку рэвалюцыі, як спадчыну ад капіталістычнага ладу, адразу на працягу аднаго году будуецца нанава. Мы ў адзін год павінны атрымаць столькі, колькі атрымалі за рад дзесяцігодзьдзяў. Гэта адзін паказальнік зусім станоўчы.

Другі паказальнік: калі мы ў гэтым годзе робім капітальных укладаньняў у прамысловасьць 25 мільён. руб., дык у будучым годзе мы будзем мець у новых, увайшоўшых у дзеяньне, прадпрыемствах—39 міл. руб.

Асноўныя аб'екты будаўніцтва ў будучым годзе—цэмэнтовы завод, гута ў Гомелі, машынабудаўнічы завод, завод сельска-гаспадарчых машын, Бабруйскі камбінат, дрэваапрацоўчы камбінат, папарова-цэлюлёзны завод, прадпр мастаўсьвага заводу, абутковая фабрыка ў Віцебску, ільна-прадзільны камбінат, бавоўняна-прадзільная фабрыка, панчошна-трыкатажная, швейная і г. д.

Вось асноўныя аб'екты. Калі іх кваліфікаваць, дык прыходзіцца сказаць, што ў асноўным мы маем пабудову заводаў на нашым мінэральным сырцы, разгортваньне заводаў на нашым драўнінным сырцы, разгортваньне заводаў на нашым сельска-гаспадарчым сырцы і некаторую групу заводаў на завозным транспартабэльным сырцы. Прычым, разьмер, які намячаецца на будучы год, значна перавышае той разьмер, які мы намячаем па пяцігодцы. Паводле пяцігодкі было намечана ўкладзіць каля 38 міл. руб., пана ўстаноўка на 49 міл. р.

Рабочыя кадры павялічваюцца на 10.000 чалавек

Мы павінны ў будучым годзе значна павялічыць кадры рабочых, занятых у нашай прамысловасьці. Гэта датычыць ня толькі кваліфікаваных, але і напоўкваліфікаваных рабочых і нават радавой рабочай сілы. Калі ўзяць асноўную масу рабочых, якая павінна быць павялічана, дык аказваецца ў сярэднім гадавым разрэзе ў 1929-30 г. супроць 1928-29 г. па мэталяпрамысловасьці трэба ўцягнуць новых 1 тыс. чалавек; па швейнай прамысловасьці больш за 2 тыс. чалавек, па гарбарнай—1.500 чал., па хэмічнай, галоўным чынам, па запалкавай—900 чал. і панчошна-трыкатажнай 500 і больш чалавек.

Вось якую групу новых людзей трэба ўцягваць у паасобныя галіны вытворчасьці. Па прамысловасьці ВСНГ мы ўцягваем больш за 9 тыс. чалавек, праўда, частка з іх пераходзіць аўтаматычна з прадкалектываў, але колькасьць іх пазначная. Трэба будзе рыхтаваць рабочую сілу. Мала таго, што гэтыя кадры трэба падрыхтаваць, іх трэба пераварыць, што называецца, у фабрычным катле ня толькі ў сэнсе ідэалёгічным, але і вытворчым. У моц таго, што намячаецца на 6 тыс. чал. больш, як на пяцігодцы, магчыма, што вытворчыя ўмовы ад гэтага будуць цярпець, г. зн. у першым паўгодзьдзі мы можам мець пагоршаньне паказальнікаў, калі ня будзем досыць добра да гэтага падрыхтаваны. Прыдуць людзі, якія ня зусім уменьць падпарадкавацца дысцыпліне, якія ня прывыклі да вытворчае дысцыпліны, ня прывыклі да працэсу фабрычнае вытворчасьці. Гэта вялікая праблема ня толькі з пункту гледжаньня палітычнай і ідэалёгічнай апрацоўкі новых кадраў, але і з пункту гледжаньня вытворчай. Зрабіць з гэтых новых мас дысцыплінаваных рабочых—справа ня лёгкая; гэта задача павінна стаяць перад ВСНГ і іншымі арганізацыямі, у прыватнасьці—перад прафсаюзамі.

Мы лічым, што тыя абставіны, у якіх разьвіваецца наша гаспадарка, гавораць за тое, што мы маем права праектаваць некаторае зьніжэньне беспрацоўя ў будучым годзе. Мы лічым зьніжэньне ў абсалютнай колькасьці на 10 проц. супроць таго, што мы маем у гэтым годзе. Я лічу, што такая ўстаноўка будзе правільнай, і ўжо зараз мы маем зьніжэньне супроць мінулага году. Мы маем арыентыроўку ва ўмовах БССР у будучым годзе на зьніжэньне так званага відзімага беспрацоўя, г. зн. беспрацоўя членаў саюзаў, зарэгістраваных на біржы працы, тых беспрацоўных, якія зарэгістраваны і маюць права разьлічваць на працу.

Павялічэньне таварнае часткі сельскае гаспадаркі

Што мы маем у адносінах ураджайнасьці? Мы маем рост па азімых на 20 проц. супроць мінулага году (раней вызначалася 18 проц.). Мы маем стабілізацыю (раней меркавалася некаторае зьмяншэньне) у адносінах яравых супроць высокага ўзроўню леташняга году. Зараз выраўноўваюцца даныя ў адносінах грубых кармоў і тут будзе некаторы рост супроць мінулага году.

Таварная частка дае рост у будучым годзе на 7 проц. па ўсёй сельскай гаспадарцы, прычым, па тэхнічных культурах мы атрымліваем рост на 30 проц.; мы маем па расьлінаводзтве рост на 6 проц., пры некаторым зьніжэньні на жывёлагадоўлі. Таварная частка жывёлы будзе таксама крыху скарочана.

***

Выходзячы з тых тэмпаў, якія намячаюцца на будучы год, і з таго, што гэтыя тэмпы маюць над сабою даволі цьвёрдую базу, трэба сказаць, што перад намі стаіць неабходнасьць перагледзець тое, што запраектавана ў пяцігодцы. Калі па прамысловасьці мы выконваем больш пяцігодкі на 26 проц., па будаўніцтве на 17 проц., калі па калектывізацыі, выходзячы з раскладу па гадох, мы павінны былі трымацца 4,5 проц. у гэтым годзе, з тым, каб пайсьці на 16 проц. да канца пяцігодкі, а мы выходзім на 8 проц. у будучым годзе, дык гэта значыць, што мы ў нашай нагрузцы ня ўлічылі тых тэхнічных, эканамічных і палітычных магчымасьцяй, якія заложаны ў нашай сыстэме, якія даюць магчымасьць разгарнуць усе тэмпы значна вышэй, як намечана па пяцігодцы.



Шпаркі тэмп разьвіцьця калектыўнае гаспадаркі БССР



Роль каапэрацыі ў таваразвароце БССР

НА АБГАВАРЭНЬНЕ ПРАЦОЎНЫХ МАС

З ПАСТАНОВЫ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР ПА ДАКЛАДУ ДЗЯРЖПЛЯНУ АБ КАНТРОЛЬНЫХ ЛІЧБАХ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ І КУЛЬТУРЫ БССР НА 1929-30 ГОД

Ацэнка папярэдніх даных 1928-29 гаспадарчага году сьведчыць аб буйнейшых посьпехах, якія дасягнуты пралетарыятам пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ў галіне гаспадарчага будаўніцтва БССР. Зьяўляючыся першым годам ажыцьцяўленьня пяцігадовай праграмы народна-гаспадарчага і культурнага разьвіцьця БССР, 1928-29 год дае малюнак буйнога росту ўсіх галін гаспадаркі на шляхох сацыялістычнае рэканструкцыі краіны. Ня гледзячы на напружаныя гаспадарчыя абставіны і цяжкасьці, у зьвязку з рэканструкцыйнымі пэрыядамі, высокія тэмпы, якія намечаны пяцігадовым планам, ня толькі выконваюцца, але ў радзе важных галін нават перавышаюцца.

У абставінах абвастрэньня клясавай барацьбы і напружанага гаспадарчага будаўніцтва, рабочая кляса праявіла вялічэзны працоўны энтузіязм, які знайшоў свой адбітак у форме сацыялістычнага спаборніцтва, і накіраваньне бядняцка-серадняцкіх мас вёскі на сацыялістычную рэканструкцыю ў сельскай гаспадарцы.

У мэтах ажыцьцяўленьня намечаных кантрольных лічбамі за 1929-30 год заданьняў у паасобных галінах народнай гаспадаркі, СНК, ухваляючы гэтыя лічбы, прапануе:

У галіне сельскай гаспадаркі правесьці зямляўпарадкаваньне на плошчы 1.080.000 гэкт. супроць 709.000 гэкт у 1928-29 г. з забесьпячэньнем зямляўпарадкаваньня ўсіх саўгасаў і калгасаў. Работы па мэліярацыі зацьвердзіць на плошчы ў 82,5 тыс. гэктараў з фінансаваньнем гэтых мерапрыемстваў па саюзным бюджэце ў 8,3 міл. руб.

Наркамзему прапануецца ўзяць рашучы курс на фармаваньне трактарных калён у колькасьці 65 і распрацаваць пытаньне аб арганізацыі дзьвох машына-трактарных станцый. Плян вапнаваньня вызначыць у разьмеры 75 тыс. гэкт. з пераапрацоўкай для гэтага 225 тыс. тон вапны. Правесьці пасевы гатунковым насеньнем у саўгасах на 100 проц. і калгасах ня менш, як на 50 проц. Прапанаваць Наркамзему арганізаваць прамысловыя гароды на 2.000 гэкт. і чатыры малочныя фермы ў прыгарадных саўгасах. Пры правядзеньні ўсіх мерапрыемстваў па разьвіцьці сельскай гаспадаркі, зямельныя органы і сельгаскаапэрацыя павінны пільна сачыць за правядзеньнем клясавага прынцыпу пры выкананьні ўсіх гэтых мерапрыемстваў.

У галіне прамысловасьці ў цэнтры ўвагі павінна быць пастаўлена выкананьне якасных паказальнікаў, як па лініі прадукцыйнасьці працы і зьнижэньня сабекошту, так і якасьці прадукцыі. ВСНГБ даручаецца дець дэтальныя заданьні ўсім трэстам не пазьней 1-га кастрычніка. Асабліва трэсты павінны зьвярнуць увагу на мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў прамысловасьці шляхам паменшэньня запасаў матэрыялу, паўфабрыкатаў і паскарэньня ўсіх вытворчых працэсаў.

ВСНГБ, Наркампрацы і прафсаюзы павінны не пазьней 1-га лістапада распрацаваць канкрэтны плян пераходу прадпрыемстваў на непарыўны тыдзень. У мэтах ажыцьцяўленьня маніфэсту юбілейнай сэсіі ЦВК СССР аб 7-гадзінным рабочым дні лічыць неабходным перавод у 1929-30 годзе на 7-гадзінны рабочы дзень ня менш 30 проц. прамысловых рабочых.

Адзначаючы, што электрыфікацыя зьяўляецца адным з найбольш напружаных вучастка ў для народнай гаспадаркі БССР, СНК лічыць неабходным пашырыць электрабудаўніцтва, прыняць захады на эканомію электраэнэргіі. Разам з тым СНК прапануе ВСНГБ забясьпечыць пуск Асінаўскай раён. электрастанцыі імя т. Сталіна (першай чаргі) не пазьней жніўня 1930 году, а таксама забясьпечыць пачатак работ па пабудове другой раённай электрастанцыі.

У зьвязку з намячаемым буйным ростам будаўніцтва ў 1929-30 годзе, СНК лічыць неабходным, каб будаўнічы камітэт пры Эканомнарадзе зараз-жа прыступіў да праверкі падрыхтоўкі арганізацыі да новага будаўнічага сэзону і канчатковага вызначэньня разьмеру будаўніцтва на 1929-30 год.

Кантрольныя лічбы на 1929-30 год намячаюць далейшы надзвычайна буйны ўздым усіх галін народнай гаспадаркі БССР і значна перавышаюць лічбы пяцігадовага пляну. Выкананьне кантрольных лічбаў патрабуе напружанай работы ад усіх гаспадарчых арганізацый і актыўнасьці шырокіх працоўных мас. У мэтах забесьпячэньня выкананьня тэмпу будаўніцтва народнай гаспадаркі на 1929-30 год, Савет Народных Камісараў лічыць неабходным сканцэнтраваць думку грамадзкіх арганізацый і працоўных мас вакол кантрольных лічбаў і шырока папулярызаваць іх. Савет Народных Камісараў лічыць, каб на аснове кантрольных лічбаў народна гаспадаркі БССР паасобныя гаспадарчыя ячэйкі мелі перад сабою канкрэтны пл. работ на будучы год. У гэтых мэт цэнтральныя гаспадарчыя арганізацы павінны ў найбольш кароткі тэрмін радаць кантрольныя лічбы на абгаворэньне працоўных мас.

Як прайшоў дзень калектывізацыі ў БССР

МАСАВЫЯ УСТУПЛЕНЬНІ БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ У КАЛГАСЫ. — ЗНАЧНА ВЫРАС ЛІК КАЛЕКТЫЎНЫХ ГАСПАДАРАК.—АРГАНІЗАВАНА ШМАТ ЧЫРВОНЫХ АБОЗАЎ З ХЛЕБАМ. — РАБОЧЫЯ БРЫГАДЫ ДАПАМАГАЛІ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ ГАСПАДАРАК

Дзесяткі рабочых брыгад на вёсцы

Рабочыя дапамагаюць калектывізацыі сельскай гаспадаркі

У Дзень калектывізацыі у вёсцы БССР выехалі сотні прафактывістых і рабочых ад варштату. Кожны саюз арганізаваў брыгаду з 4-8 чалавек, забясьпечыў яе належнай інструкцыяй і паказаньнямі. На гэты раз брыгады выехалі ў вёску не на адзін-два дні, а на 2-3 тыдні.

Якія заданьні атрымалі рабочыя брыгады, што выехалі ў вёску?

У першую чаргу рабочыя брыгады павінны **правесьці работу па калектывізацыі сельскай гаспадаркі, шырока растлумачыць сялянам перавагу калектыўных гаспадарак над індывідуальнымі.** Рабочыя брыгады праводзяць запіс сялян, якія жадаюць аб'яднацца ў калгасы.

Белкамітэт **саюзу мэтапістых** паслаў у вёску 4 чалавек на два тыдні.

Акрамя таго, прадпрыемствы, аб'яднаныя саюзам мэталістых, па лініі пэфства паслалі ў раёны 10 чалавек. («Энэргія»—4 чал., завод «Камунар»—4 чал., «Эльвод»—2 чал.).

Завод «Энэргія» падпёс сваёй падшэфнай вёсцы пажарны насос і рад іншых падарункаў.

Завод «Чырвоны Мэталісты» (Віцебск) паслаў у падшэфныя вёскі дзьве брыгады—**агітацыйную і рабочую.** Агітацыйная брыгада займаецца растлумачальнай работай сярод сялян па ўсіх важнейшых кампаніях. Рабочая брыгада складзена з сьлесароў і кавалёў і займаецца рамонтам с.-г. інвэнтару бяднейшых сялян.

Абедзьве брыгады выехалі ў вёску на 3 тыдні.

Чыгуначнікі Менскага вузлу паслалі ў вёску рабочую брыгаду з 7 чалавек на 2 тыдні.

Рабочыя-чыгуначнікі пастанавілі наладзіць 2-х гадзінны «суботнік» у фонд арганізацыі ў падшэфнай вёсцы машыннага таварыства.

Акрамя таго ў фонд калектывізацыі па асобных мясцкомах чыгункі праводзіцца надзельнік. Усяго, дзякуючы суботніку і надзельніку, мяркуецца сабраць каля 3.900 руб.

Рабочыя майстэрняў малага рамонту вагонаў арганізуюць у сваёй падшэфнай вёсцы (Кайкаўскі сельсавет) калгас. Ужо пасланы прадстаўнікі для перагавораў з РВК.

Гомельскія чыгуначнікі стварылі дзьве майстэрні ў вагонах і пусьцілі іх па лініі. Майстэрні рамантуюць с.-г. інвэнтар беднякоў ваколічных вёсак.

Саюз **гарбароў** адпусьціў на правядзеньне пасевак[illegible] 500 руб.

Акрамя таго, гарбарня «Бальшавік», фабрыка абутку і інш. прадпрыемствы камандзіравалі сваіх прадстаўнікоў для шэфскай работы ў вёску.

Беларускі камітэт саюзу харчавікоў асыгнаваў 500 руб. на выдаткі па пасылцы рабочых брыгад у вёску. Пасланa 6 чалавек на 2 тыдні, акрамя тых, якія паехалі, як прадстаўнікі ад асобных прадпрыемстваў.

Рабочыя заводу «Чырвоная Зара» правялі ў сваім падшэфным сельсавеце вялікую работу па растлумачэньні задач калектывізацыі. Дзякуючы гэтай рабоце сяляне арганізавалі чырвоны абоз і прывезьлі ў Менск 200 пуд. хлеба. Зараз сяляне рыхтуюць чырвоны абоз у фонд індустрыялізацыі краіны.

Менскія **дрэваапрацоўшчыкі** накіравалі ў вёску 4 чалавекі. Завод «Дрэваапрацоўшчык» і фабрыка «Адраджэньне» паслалі свае брыгады.



Чырвоны абоз калгасу „Ленінскі шлях", які здаў у дзень калектывізацыі 1000 пудоў хлеба

4.000 пудоў хлеба--дзяржаве

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Сяляне Клімавіцкага раёну дзень калектывізацыі адзначылі ўзмоцненай здачай праз чырвоныя абозы хлебных лішкаў дзяржаве.

28-га жніўня першы абоз з 62 фурманак прыбыў у г. Клімавічы з калгасу «Ленінскі Шлях» і даставіў звыш 1.000 пуд. хлеба.

Нядаўна арганізаваны калгас «Камунар» здаў 500 пудоў хлеба, пяць калгасаў і некалькі вёсак Гусарскага сельсавету здалі звыш 600 пуд.

Усяго-ж па Клімаўшчыне ўжо здана каля 4.000 пудоў хлебных лішкаў.

Здача хлеба чырвонымі абозамі ў г. Клімавічах
На здымку: Прыём збожжа на складзе крэдытнага т-ва

Будуецца трактарная калёна

МАГІЛЕЎ (наш кар.). У Клімавіцкім раёне пачаўся збор сродкаў на пабудову трактарнай калёны.

Рабочыя, служачыя і калгасьнікі адлічваюць процанты ад свае пэнсіі, а таксама адпрацоўваюць гадзіну на пабудову трактарнае калёны.

За 28-га жніўня—дзень калектывізацыі—на пабудову трактарнай калёны ўжо сабрана звыш 1000 руб. Усяго ў раёне мяркуецца сабраць на гэту мэту каля 10.000 руб.

Першы сноп у фонд калектывізацыі

ЗАСЛАЎЕ. (Наш кар.). У раёне за апошні час арганізаваны 4 новыя калгасы. На сходах па ўсіх калгасах прыняты пастановы аб адлічэньні заработку ад працы 28-га жніўня ў фонд калектывізацыі.

На сходзе ў вёсцы Загор'е сяляне вынесьлі пастанову ўсім падпісацца на 3-ю пазыку індустрыялізацыі.

Па трох калгасах за адзін дзень падпіска дала 275 рублёў.

Адзін з калгасаў унёс першы сноп —15 пудоў жыта у фонд калектывізацыі.

У калгасе «Агракультура» два тыдні працавала рабочая брыгада мэталістых з Менску. Сяляне-калгасьнікі шчыра дзякавалі ўдзельнікам брыгады за аказаную дапамогу па ўборцы ўраджаю.

Цэлыя вёскі пераходзяць ў калгасы

Сяляне разьвітаюцца з дзедаўскімі спосабамі земляскарыстаньня

Дзень калектывізацыі па Менскай акрузе адзначыўся масавым уступленьнем сялянскіх гаспадарак у калгасы.

У Пухавіцкім раёне да калгасу «Гарапашнік» далучылася палова вёскі Цешкава з 23-х двароў. Уся вёска Лядцо з 72 двароў перайшла ў калгас.

У Капыльскім раёне вёска В. Усава з 63 двароў далучылася да яўрэйскага калгасу імя Абрамовіча. Вёска Кабыльчыцы з 44 двароў арганізавала калгас на плошчы ў 350 гэктараў. 63 двары вёскі Ванелевічы таксама ўвайшлі ў калгас.

Пасёлак Лазюкі цалкам далучыўся да калгасу, арганізаванага сялянамі м. Капыль.

Датэрміновая здача падатку ў дзень калектывізацыі

ГОМЕЛЬ (наш кар.). У Веткаўскім раёне за адзін дзень 28 жніўня паступіла больш 11 тыс. руб.—датэрміновых узносаў па сельска-гаспадарчым падатку.

Яўрэйскі калгас імя Калініна

БАБРУЙСК (наш кар.). У Сьвіслацкім раёне ля в. Сяліба ў дзень калектывізацыі арганізаваўся яўрэйскі калгас на плошчы 350 гэктараў. Калгас назвалі імя М. І. Калініна.

Да рэарганізацыі апарату Віцебшчыны

Ліквідаваць самастойныя страхавыя агэнцтвы ў Віцебшчыне

Рэарганізацыя страхавых органаў дасьць 14 тысяч руб. эканоміі

Адно з важных пытаньняў рэарганізацыі апарату Віцебскай акругі—гэта **рэарганізацыя органаў дзяржстраху.** Трэба наблізіць іх да насельніцтва, зрабіць іх больш аўтарытэтнымі, спрасьціць іх работу і разам з гэтым патаніць утрыманьне апарату.

Перш за ўсё падкамісія па рэарганізацыі прыйшла, што цяперашняе становішча акруговых і раённых страхорганаў, адарваных ад АВК, РВК, і ня вьязваных з імі арганічна, ня можа нас ні ў якім разе задаволіць.

Страхавыя органы павінны быць увязаны з агульнай сыстэмай адміністрацыйна-фінансавага апарату, асабліва ў акрузе і раёне. Дзеля гэтага падкамісія намячае **ліквідаваць акруговыя і раённыя агэнцтвы, як самастойныя органы, і аб'яднаць іх: у раёне з апаратам РВК, у акрузе з фінансавай інспэкцыяй (замест акрфа) пры прэзыдыуме АВК, у горадзе з гарсаветам для абслугоўваньня горараду.** Поўная адказнасьць за ўсю страхавую работу ўскладаецца на РВК, гарсаветы, сельсаветы і АВК. Гэтым мы дасягаем апарата выразнасьці ў рабоце, наблізжэньня апарату да насельніцтва, а значыць, лепшага яго абслугоўваньня, зьмяншэньня чыста адміністрацыйных адзінак, арганічнага аб'яднаньня ўсёй страхавой работы, спрашчэньня тэхнікі працы, зьнішчаньня паралелізму ў рабоце дзяржстраху, фінорганаў і РВК. Усё гэта дазволіць таксама зьмешыць акругова-раённы страхавы апарат на 38,6 проц. (з 44 штатных і няштатных асоб па акрузе і раёне пакінуць 27 штатных адзінак).

У сувязі з паказанай рэарганізацыяй акругова-раённага апарату, мяркуецца і Белдзяржстрах рэарганізаваць у кіраўніцтва НКФ. Такая рэарганізацыя, разам са зьменай сыстэмы работы і кантролю, дасьць магчымасьць скараціць апарат Белдзяржстраху да 68 проц. (з цяперашняга штату ў 69 адзінак досыць будзе 22-23 адзінкі).

Рад страхавых функцый трэба будзе перадаць сельсаветам.

У апараты РВК будуць уведзены ад 1 да 2-х адзінак, а ў буйным Віцебскім раёне і трэцяя адзінка за рахунак дзяржстраху. **Таксама раённаму, гарадзкому і акруговаму бюджэтам будуць перададзены адпаведныя сродкі дзяржстраху на гаспадарча-канцылярскія выдаткі, на разьезды, спэцвопратку і інш.**

Уся страхавая работа па горадзе Віцебску будзе выконвацца гарсаветам, у апарат яго ўводзіцца 5 адзінак з агентам-інкасатарам і агентам па асобістым страхаваньні. Пры гэтым як у горадзе, так і ў раёне ўсякая камісійная плата і ўтрыманьне на процантах асобных адзінак (агентаў, субагентаў, аквізытараў) ліквідуецца, а замест гэтага ўводзіцца цьвёрды штат з цьвёрдымі акладамі і нормамі работы.

Кіраўніцтва, інструктаваньне кантроль за ўсёй работай на акрузе застацца за прэзыдыумам АВК і праводзіцца праз акрстрахавога інспэктара, які знаходзіцца ў складзе фінансавай інспэкцыі (б. акрфа).

Падкамісія высунула і праект **ліквідацыі каапэрацыйнага страхаваньня і аб'яднаньня гэтай работы ў адзіным апараце—дзяржстраху.** Самастойнае існаваньне каапэрацыйнага страхаваньня выклікае шмат непаразуменьняў паміж органамі дзяржстраху і каапэрацыйнай сыстэмай.

Высунута пытаньне і наконт адначасовага з с.-г. падаткам налічэньня страхавых акладаў, што зьменшыць работу. Дзеля гэтага патрэбна, каб страхавое законадаўства выдавалася ўрадам разам з законадаўствам па с.-г. падатку.

Для ўзмацненьня сельскіх саветаў часовымі працаўнікамі па страхавой справе, пастаноўлена ў бюджэт сельсавету адлічваць 2,35 проц. ад сум паступіўшых акладных збораў.

Агульная сума эканоміі ад паказанай рэарганізацыі страхавых органаў на Віцебшчыне вызначаецца ў суме каля 14 тысяч руб., якія мяркуецца часткова скарыстаць на павышэньне акладаў страхавых супрацоўнікаў.

У куткім часе гэты праект рэарганізацыі будзе разгледжаны ўрадовай камісіяй.

С. ЯЦКОЎ

Новы калгас „Чырвоны Штандар"

СМАЛЯВІЧЫ. (Наш кар.). Ва ўрочышчы «Пераможнае», Пліскага сельсавету, Смалявіцкага раёну арганізаваўся вялікі калгас над назвай «Чырвоны Штандар». Ўрачысты сход калгасьнікаў паслаў прывітальную тэлеграму ЦК КП(б)Б, у якой запэўняе, што сяляне, уступіўшыя ў калгас, зробяць усё магчымае, каб уцягнуць у калектыўную гаспадарку ваколічнае сялянства і гэтым выканаць дырэктывы партыі.

Усеагульнае навучаньне на Аршаншчыне

ВОРША. (Наш кар.). З пачатку новага навучальнага году на Аршаншчыне ўводзіцца абавязковае навучаньне дзяцей звыш 8 год. Прэзыдыум АВК прапанаваў усім райвыканкомам растлумачыць насельніцтву значэньне ўсеагульнага навучаньня.

Чырвоныя франтавікі ў Менску

У склад дэлегацыі чырвоных франтавікоў, якія прaехалі ў СССР праз Менск, уваходзіць 12 чалавек, з іх 9 мужчын і тры жанчыны. Усе яны прадстаўнікі заходня-саксонскай арганізацыі «рабочай аховы», якая заснавана замест распушчанага саюзу чырвоных франтавікоў.

Два дэлегаты **Грынвальд**, Вольтэр Роляндр застаюцца ў Менску і пазапрашэньні АБВШ і беларускіх камсамольцаў будуць удзельнічаць у сьвяткаваньні МЮД'у і выпуску курсантаў АБВШ. Рэшта нямецкіх таварышоў учора выехала ў Маскву.

Дэлегат **Грынвальд** зьяўляецца рабочым кавалём. Ён працаваў на заводзе пажарных машын і на заводзе па выпрацоўцы с.-г. інвэнтару. За рэвалюцыйную работу т. Грынвальд быў звольнены з абодвых заводаў. Ён член нямецкай кампартыі і камсамолу.

Вальтэр Роляндр па прэфэсіі пекар, карэспандэнт «Чырвонай Зьмены». Працуе на кантытэрскай фабрыцы. Тав. Роляндр камуністы і член камсамолу.

Абодвых дэлегатаў абіралі на канфэрэнцыі заходня-саксонскай акруговай арганізацыі.

***

29 жніўня ў АБВШ быў наладжаны сямейны вечар, дзе і прысутнічалі нямецкія госьці. Адімя школы вітаў нямецкіх таварышоў загадчык школы т. Васілевіч.

Учора дэлегаты наведалі ЦК ЛКСМБ і рэдакцыю газэты «Чырвоная Зьмена», дзе яны азнаёміліся з жыцьцём беларускага камсамолу. Увечары нямецкія госьці прысутнічалі на канфэрэнцыі рабочай моладзі.

Дэлегаты саксонскай рабочай аховы **Грынвальд** і **Вальтэр Роляндр** прывезьлі з сабою фашысцкія значкі і жалезны крыж, адабраныя ў часе схваткі з фашыстымі.

Прэзыдыум ЦСПСБ аб ходзе чысткі савецкага апарату

Аб выніках абсьледваньня правядзеньня праверкі і чысткі савецкага апарату і ўдзеле ў гэтай працы прафсаюзаў, на прэзыдыуме ЦСПСБ далажылі прадстаўнікі НК РСІ і ЦП саюзу саўтандальслужачых.

У рэзалюцыі, прынятай прэзыдыумам ЦСПСБ, адзначан рад хібаў і недахопаў у канкрэтным правядзеньні чысткі і праверкі савецкага апарату.

Ня гледзячы на тое, што была добра разгорнута шырокая падрыхтоўчая растлумачальная кампанія, прафарганізацыі надта няўважліва аднесьліся да чысткі і праверкі ўстаноў.

Чыстка савецкага апарату—гэта адна з форм клясавай барацьбы. Партыя і вышэйшыя прафорганы па выкананьні такое важнае палітычнае задачы далі цэлы рад дырэктыў. Але ЦП саюзаў (асабліва саюзу саўтандальслужачых) і акруговыя прафбюро не зразумелі правільна задачы чысткі, аднесьліся да яе неахайна. А дзякуючы гэтаму нізавыя прафэсыянальныя ячэйкі (мясцкомы і фабзаўкомы) пакуль што на справе не зьяўляюцца актыўнымі кіраўнікамі і правадырамі чысткі і праверкі савецкага апарату. Гэта вялікая справа праходзіць бяз удзелу шырокіх рабочых мас. А таму прэзыдыум ЦСПСБ лічыць неабходным, каб усе ЦП саюзаў і акрпрафбюро ва ўсіх гарадох і акругах арганізавалі агульна-гарадзкіх і агульнараённыя сходы рабочых і пленумы мясцкомаў і фабзаўкомаў. Трэба дабіцца самага актыўнага ўдзелу рабочых мас і саміх прафсаюзаў у практычнай рабоце чысткі савецкага апарату.

Побач з гэтым трэба адзначыць, што чыстка савецкага апарату праходзіць галоўным чынам у напрамку праверкі асабістага складу ўстаноў. Слаба зьвяртаецца ўвага на барацьбу з бюракратычнымі скрыўленьнямі клясавай лініі. Слаба вывучаецца і дрэнна правяраецца якасьць работы. Найважліва праходзіць праверка спрашчэньня, патаненьня і набліжэньня да мас апарату дзяржаўных, гаспадарчых і іншых савецкіх устаноў. Не вывучаецца палянпшэньне мэтадаў работы; не зьвяртаецца належнае ўвагі на спрашчэньне сыстэмы апарату. Ёсьць установы, у якіх чыстка праходзіць нават без належнай арганізацыйнай і палітычнай падрыхтоўкі. Няма плянавасьці ў правядзеньні гэтай работы. Камісіі па чысткі апарату сваю работу ня ўвязваюць з прафсаюзнымі арганізацыямі.

Прэзыдыум ЦСПСБ лічыць абавязковым, каб перад чысткай установы кіраўнік гэтай установы на агульных сходах рабочых фабрык і заводаў падрабязна азнаёміў рабочых з работаю гэтае ўстановы. У часе правядзеньня самое чысткі трэба дабівацца ўдзелу ў чысткі ня толькі рабочых брыгад, але і ўсяе масы рабочых. Шырока і пастаянна інфармаваць рабочых аб ходзе чысткі як на масавых рабочых сходах, так і праз друк: насьценныя і шматтыражныя газэты.

Абсьледваньне паказала, што работа эканомкамісіі правяраемых устаноў праходзіць адарвана ад чысткі і праверкі савецкага апарату. Эканомкамісіі і мясцкомы ня прымаюць актыўнага ўдзелу ў выяўленьні недахопаў у працы апарату. Мясцкомы і фабзаўкомы не дапамагаюць рабочым брыгадам і камісіям садзейнічаньня чысткі апарату, а абмяжоўваюцца толькі вылучэньнем у склад камісій па чысткі сваіх членаў.

Рабочыя брыгады, што вылучаны для праверкі матар'ялаў паасобных служачых установы, ня былі ўцягнуты ў працу камісій па чысткі. А гэта ўсё бязумоўна моцна адбілася на якасьці чысткі. А таму прэзыдыум ЦСПСБ прапануе прафарганізацыям і асабліва саюзу саўтандальслужачых узмацніць кіраўніцтва мясцкомамі і фабзаўкомамі. Трэба, каб работа эканомкамісіі ў часе чысткі была пастаўлена на належную вышыню. МК, ФЗК і эканомкамісіі павінны больш грунтоўна дапамагаць камісіям па чысткі. Павінны вывучаць і выяўляць якасьць работы апарату. Трэба, каб мясцкомы, фабзаўкомы і эканомкамісіі дапамаглі ўстановам патаніць і спрасьціць іх апарат, наблізіць яго да рабочых мас. Палепшыць сыстэму апарату і знайсьці лепшыя мэтады работы.

В.

У ПРЭЗЫДЫУМЕ ЦСПСБ

ЯКІЯ САЮЗЫ АТРЫМЛІВАЮЦЬ ДАПАМОГУ З МІЖСАЮЗНАГА ФОНДУ

На адным з паседжаньняў прэзыдыуму ЦСПСБ было пастаноўлена арганізаваць міжсаюзны фонд для ліквідацыі няпісьменнасьці сярод членаў прафсаюзаў у суме 20 тысяч рублёў. У зьвязку з набліжэньнем навучальнага году на апошнім паседжаньні прэзыдыум пастанавіў разьмеркаваць гэты фонд паміж тымі саюзамі, у якіх нехватае сваіх сродкаў для поўнага ахопу няпісьменных. Згодна гэтай пастановы фонд разьмяркоўваецца наступным чынам: саюзу сельгаспрацоўнікаў—11 тысяч рублёў; саюзу харчарчаваньня—5 тысяч рублёў; тэкстыльшчыкам—1.600 рублёў; камунальнікам—1.400 рублёў; транспартнікам—тысячу рублёў.

ФОНД САЦЫЯЛІЗАВАНАЙ ЗАРПЛАТЫ

З мэтаю задавальненьня культурна бытавых патрэб тых асоб, якія працуюць па найму і ў першую чаргу дапамагчы масавому ўцягненьню дзяцей рабочых і служачых у школы і прафэсыянальна-тэхнічныя навучальныя ўстановы, ЦВК СССР пастанавіў стварыць фонд сацыялізаванай зарплаты. Гэты фонд будзе складацца з адлічэньняў у разьмеры аднаго процанту ад усяе сумы зарплаты, што выдаецца рабочым і служачым ва ўстановах і прадпрыемствах. Прэзыдыум ЦСПСБ з гэтым праектам закону згадзіўся. Адлічэньні будуць рабіцца з 1-га кастрычніка 1929 году.

ДРУГІ ДЗЕНЬ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ

Прэзыдыум ЦСПСБ заслухаў інфармацыю аб прапановах цэлага раду прафарганізацый, якія мяркуюць правесьці другі дзень індустрыялізацыі 26-га сьнежня. Прэзыдыум згадзіўся з гэтымі прапановамі і даў указаньні абгаварыць гэта на сходах рабочых.

Усесаюзны прабег матацыкляў

Урачыстае спатканьне ўдзельнікаў прабегу — у Віцебску

Беларусі Аўтадор пачаў падрыхтоўку да ўсесаюзнага прабегу мотоцыклаў савецкай канструкцыі, які наладжваецца Аўтадорам РСФСР. Маршрут прабегу: Іжэўск—Казань, — Ніжні-Ноўгарад—Масква—Лёнінград—Пскоў—Віцебск — Арол Смаленск — Харкаў — Масква агульнай адлегласьцю да 4000 клм. У прабеге прымуць удзел 6 матацыклаў савецкай канструкцыі, 10-12 матацыклаў эўрапейскіх і амэрыканскіх фірм і 4 аўтамабілі. У Віцебску будзе наладжана урачыстае спатканьне ўдзельнікаў прабегу.

МЕНСК

Пуск трамваю адкладзены на месяц

У свой час трамвайнае кіраўніцтва заключыла некалькі дагавораў з заводам у Мытышчах на пастаўку для Менску да 25 верасьня 10 трамвайных вагонаў. Як высьветлілася, завод гэтых дагавораў ня выканаў.

Гэтымі днямі трамвайнае кіраўніцтва заключыла з Мытышчынскім заводам новы дагавор, згодна якога першыя пяць трамвайных вагонаў павінны быць дастаўлены ў Менск да 25 верасьня і другія 5—да 10 кастрычніка.

У трамвайным кіраўніцтве лічаць, што заказ у гэтыя тэрміны будзе выкананы, і Менскі трамвай будзе пушчаны ў канцы кастрычніка, гэта зн. на месяц пазьней, чым меркавалася раней.

НК РСІ СССР са свайго боку прапанаваў трэсту «Гомза», які ўзяў заказ, у тэрміновым парадку даць тлумачэньне аб прычынах невыкананьня заказаў.

У сучасны момант амаль усе работы па пабудове трамваю скончаны. Праложана каля 15 кілёмэтраў шляху. Пабудова трамвайнага парку мае быць скончана ў лістападзе.

300 тысяч рублёў на жыльлёвае будаўніцтва

Белмэталятрэстам намечана затраціць 300 тысяч руб. на жыльлёвае будаўніцтва для рабочых сельска-гаспадарчага заводу, які зараз будуецца ў Гомелі. На пабудову амбуляторыі і сталоўкі будзе затрачана 50 тыс. руб.

Будуецца новы Менск

У Менскі камітэт паступіў ад розных устаноў цэлы рад заявак аб адводзе вучасткаў для пабудовы будынкаў, галоўным чынам, для навукова дасьледчых інстытутаў. Для разьмяшчэньня гэтых устаноў мяркуецца адвесьці вучастак у раёне Барысаўскага і Лагойскага трактаў плошчай у некалькі сот гэктараў. На гэтым вучастку намячаецца пабудова Акадэміі Навук, пашырэньне клінічнага гарадка, інтэрнатаў для студэнцтва і прафэсуры і інш. У гэтым-жа раёне ўжо будуюцца ўсебеларускі стадыён, усебеларуская выстаўка сельскай гаспадаркі. Там-жа праектуецца пабудова новай кіно-фабрыкі.

Дапамажэце бясспрытульным дзецям

Цэнтральная дзіцячая камісія пры ЦВК БССР ня раз зварачалася да Полацкага акрвыканкому аб аказаньні дапамогі Полацкай акр. дзіцячай камісіі і з свайго боку таксама аказала ўсямерную дапамогу, даўшы датацыю на змаганьне з дзіцячай бясспрытульнасьцю ў Полацкай акрузе. Але да гэтага часу нічога акрвыканком не зрабіў. Цэнтральная дзіцячая камісія просіць Полацкі акрвыканком выдаліць акрг. дзіц. кам. ад выплаты 1.200 р. арэндной платы за шавецкую майстэрню, дзе навучаліся бясспрытульныя дзеці.

Перад новым навучальным годам

Калі пачнуцца заняткі ў унівэрсытэце

Праўленьне БДУ пастанавіла працягнуць залікавую эсэію да 25 верасьня. Заняткі на ўсіх факультэтах пачнуцца з 1 кастрычніка.

Новыя школы для рабочых

З гэтага году ў Менску адкрываецца 5 новых 2-гадовых школ першай ступені для рабочых. Школы будуць рыхтаваць слухачоў для паступленьня ў школы ўзвышанага тыпу. У новыя школы будзе прынята каля 300 ч.

Курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ на прадпрыемствах

У Менску скончыліся заняткі на курсах па падрыхтоўцы рабочых ў ВНУ і на рабфаці. Выпушчана 149 ч., з іх 68 будуць прыняты ў ВНУ без іспытаў.

Прэзыдыум ЦСПСБ выказаўся за арганізацыю ў будучым годзе такіх-жа курсаў на больш буйных прадпрыемствах, як „Бальшавік", „Меншэвік" і інш. Пры Меншэвіку намячаецца адкрыцьцё вэчэрняга аддзяленьня. У Горках будуць адкрыты курсы для падрыхтоўкі батракоў для паступленьня ў Беларускую с.-г. акадэмію.

СУД

Злосныя неплацельшчыкі падаткаў

Перад судовым сталом яўрэйскай нацкамэры—браты Тасьманы—буйныя менскія галянтарэйшчыкі. Сумныя вочы, нясьмелы голас і, нарэшце, спецыяльны «пралетарскі» гарнітур—усе атрыбуты злосных неплацельшчыкаў падаткаў, звычайная абстаноўка 93 арт.

Сутнасьць справы не складаная. Вялікі магазын на Ленінскай вул., зварот звыш 60.000 руб. і «злые козні» фінінспэктара. Запазычанасьць па падатках абодвых братоў каля... 10.000 руб.

— Дайце нам магчымасьць працаваць, і мы з цягам часу разьлічымся з акрфа,—просяць у апошнім слове браты Тасьманы.

Яўрэйская нацкамэра іх хадайніцтва «здавальняе» і прыгаворвае аднаго да 3-х, а другога да 9-ці месяцаў прымусовых работ.

На тым-жа пасяджэньні 28-га жніўня за нявыплату падаткаў звыш 8 тысяч рублёў скарняк Чарняўскі прыгаворваецца да 9-ці месяцаў прымусовых работ.

А.

638.000 рублёў нядоімак за прыватным сэктарам

Паводле ведтак бюро фінансава-падатковай сэкцыі Менскага гарасавету за прыватным сэктарам у Менску лічыцца 638.000 р. нядоімак. Гэта вынікае з вынікам таго, што ў свой час на было прынята належных мер да ліквідацыі нядоімак. Ня было таксама выразнасьці ў працы апарату Менакрфа па апяганьні гэтых нядоімак.

Бюро фінансавай сетні прызнала патрэбным узмацніць апяганьне нядоімак. Да гэтай работы павінна быць прыцягнута ўвага рабочай грамадзкасьці. У першую чаргу павінны быць скарыстаны для абсьледваньня плацельшчыкаў члены гарадзкога савету.

Пабудова павільёнаў усебеларускай с.-г. выстаўкі

Разгортваецца будаўніцтва ўсебеларускай сельска-гаспадарчай і прамысловай выстаўкі. Пачалася пабудова павільёнаў—прамысловага, земляробчага, жывёлагадоўчага і мэліярацыйнага. Усе асноўныя пабудовы будуць скончаны ў сёлетнім будаўнічым сэзоне. На тэрыторыі выстаўкі будуць праведзены—водаправоднаканалізацыя, электрычная лінія і г. д.

За дзень

Зубалекавая перасоўка. Акруговы камітэт Чырвонага Крыжу арганізаваў зубалекавую перасоўку, якая за апошні час працавала ў вёсках Плешчаніцкага раёну. Перасоўкай аказана дапамога 800 хворых.

Аграномаў у вёску. Для правядзеньня дня калектывізацыі ў раёны Менскае акругі выехала 7 аграномаў.

Аўтабусныя зносіны Менск—Лагойск. Пачаў курсаваць паштовы аўтабус Менск—Лагойск, які разам з поштай перавозіць і пасажыраў. Аўтабус адпраўляецца з Менску кожны дзень.

Здарэньні

Затрымана прастытутка В. Астроўская, якая заразіла сыфілісам рад асоб.

***

Прыцягнуты да адказнасьці за ўтрыманьне прытону гр. Шульскія Антось і Стэпа.

***

„Злодзейскі калектыў" цыганоў зрабіў рад наскокаў на вёскі Грэскага раёну. Шляхам пралому дахаў яны пакралі ў сялян хатнія рэчы.

ЗАЎТРА МІЖНАРОДНЫ ЮНАЦКІ ДЗЕНЬ

Менская камсамолія рыхтуецца

Арганізоўваюцца гурткі па вывучэньні міжнароднага юнацкага руху, наладжваюцца суботнікі на карысьць КІМ'у

Рабочая моладзь уступае ў рады камсамолу

Падрыхтоўчая работа ахапіла шырокія пласты працоўнае моладзі як у горадзе, так і на вёсцы. Праведзены рад розных сходаў і канфэрэнцый рабочай і сялянскай моладзі. Асабліва з вялікай актыўнасьцю прайшлі канфэрэнцыі, прысьвечаныя дню МЮД'у.

Ва ўсіх камсамольскіх ячэйках арганізаваны гурткі па вывучэньні міжнароднага юнацкага руху.

31 жніўня па ячэйках адбудуцца масавыя вечары трох пакаленьняў, да якіх зараз праводзіцца ўзмоцненая падрыхтоўка.

Усёй камсамольскай арганізацыяй будзе праведзены двухгадзінны суботнік, сродкі ад суботніка пойдуць на карысьць сэкцыі КІМ'у. Ужо ў шмат якіх ячэйках суботнікі праведзены. Ячэйка фабрыкі «Адраджэньне» ад суботніку мела 150 руб. Вясковыя камсамольскія ячэйкі суботнікі праводзяць па дапамозе беднаце і сем'ям чырвонаармейцаў, убіраюць ураджай, рамантуюць дарогі, школы, грамадзкія памяшканьні.

Яч. заводу «Энэргія» арганізавала ўдарную брыгаду. Некалькі камсамольцаў сумесна з пажарнай дружынай выяжджаюць у падшэфную вёску, бяруць з сабой у падарунак пажарную помпу.

Арганізоўваецца суботнік на карысьць КІМ'у з удзелам беспартыйнай моладзі, а магчыма і дарослых рабочых. Да дня МЮД'у падана ўжо 1[illegible] заяў рабочых заводу аб уступленьні ў камсамол.

У ячэйку гарбарні «Бальшавік» падана 15 заяў аб уступленьні ў камсамол.

У дзень МЮД'у будзе зроблена перадача сродкаў на самалёт «Камсамолец Беларусі».

***

Да МЮД'у прыстасоўваецца адкрыцьцё ў Менску тэатру рабочай моладзі.

Учора ўвечары ў садзе «Прафінтэрн» адбыўся масавы вечар трох пакаленьняў.

Першыя вынікі

Побач з карпусамі Якаўлевіцкай суконнай фабрыкі раскінуўся рабочы пасёлак. Калі вы першы раз праходзіце па пасёлку, вас вьдзівіць вялікая колькасьць розных драўляных будынкаў.

Што гэта за будынкі?

Для жывёлы — адкажуць вам.

Гэта гаворыць, што фабрыка моцна зраслася з сельскай гаспадаркай. Бывае, што нельга распазнаць у пасёлку чалавека, да каго ён належыць — да рабочых ці да сялян. Гэты нераспазнаны чалавек, адпрацаваўшы паложаны час на фабрыцы, з усіх сіл сьпяшаецца да хаты. Яго там чакае другая праца... на сельскай гаспадарцы. І на фабрыцы мала такіх рабочых, якія ня маюць уласных кавалкаў зямлі, кароў і іншай хатняй жывёлы. Клопаты аб сваёй асабістай гаспадарцы прымушаюць рабочых да позьняй ночы працаваць ля двара. Трэба-ж пасеяць і пажаць.

Сярод рабочых ёсьць і такія, якія маюць гаспадарку больш, чым серадняцкую. Вядомая рэч, што такія рабочыя ня могуць быць зацікаўлены павышэньнем прадукцыйнасьці працы, паляпшэньнем якасьці прадукцыі і наогул жыцьцём фабрыкі.

Таму нельга зьдзіўляцца, што рабочыя больш цікавяцца павялічэньнем пэнсіі, чым зьніжэньнем сабекошту прадукцыі (сярэдні заработак на фабрыцы 90 руб. у месяц).

У апаратурным цэху рабочыя адмовіліся аднесьць сукно ў сумежны цэх (паводле калектыўнай умовы гэта рабіць яны былі абавязаны). Асобныя рвачы закідалі заявамі прафарганізацыю аб павялічэньні расцэнак, тады як расцэнкі і так надзвычайна вялікія. Такое самае становішча мае месца і ў радзе іншых цэхаў.

У стругальным цэху была ўстаноўлена норма выпрацоўкі — 6 кавалкаў. Норма ня выконвалася, «як вельмі вялікая». Пры пераходзе на зьдзельшчыну выпрацоўка дасягнула 12-15 кускоў замест пяці.

Вузкія цэхавыя інтарэсы многіх рабочых склалі надзвычайна цяжкія ўмовы для працы на фабрыцы. Сялянскія настроі вельмі часта вылёваюцца на сходах.

Рабочыя ў грамадзкай працы ня ўдзельнічаюць. Партыйная ячэйка на рад хваравітых зьявішч на фабрыцы сім не рэагавала. Ініцыятыва ў пачатку спаборніцтва выходзіла ад групы камуністых, якіх падтрымаў цалкам ткацкі цэх і гэта перадавая частка рабочых змагаецца з рвачамі на фабрыцы.

Цяжка было зрабіць першае пачынаньне.

За кароткі час спаборніцтва дало вялікія вынікі: узрасла прадукцыйнасьць працы. Выпрацоўка на аднаго ткача да ўступленьня ў спаборніцтва дасягала толькі 17-18 мэтраў у дзень, зараз выпрацоўка дасягнула 20,3 мэтры. Нельга прайсьці міма ініцыятараў спаборніцтва Тав. Васільева — работніца-ткач ідзе ўперадзе спаборніцтва. Яна павялічыла выпрацоўку больш чым ня суставарышкі. Яна скардзіцца на тое, што ня ўсе яшчэ рабочыя ўважліва адносяцца да вытворчасьці. У часе працы рабочыя па некалькі дзесяткаў хвілін трацяць на курэньне, на марныя гутаркі, усё гэта адбіваецца на прадукцыйнасьці працы.

Асобныя партыйцы з некаторай прыемнасьцю прынялі выклік на спаборніцтва. Так член партыі Данілюк на пасяджэньні бюро партыйнай ячэйкі выступіў з такой прамовай — «на каго буду працаваць, выпрацоўку падняць я не магу. Спаборніцтва — гэта шыльда пад якой хаваецца эксплёатацыя рабочае клясы».

Камуністы Шаблоўскі замест уздыму прадукцыйнасьці працы робіць зусім адваротнае. Шаблоўскі за ўвесь час сваёй працы на фабрыцы ніколі ня дапраграмнае выпрацоўкі. Сваё гультайства і сімуляцыю на фабрыцы ён кампенсуе «перагружанасьцю працай у камсамоле», вялікай занятасьцю на вытворчасьці. Нас зьдзіўляе, чаму «пчыры» комсамольскі працаўнік, «прыкладны» рабочы Шаблоўскі застаецца да гэтага часу на працы. Шаблоўскі — сакратар камсамольскай ячэйкі. Ці можна Шаблоўскаму даручыць справу выхаваньня зьмены нашай партыі?

На гэта пытаньне павінна адказаць парт'ячэйка і камсамольскі райком.

Ул. МЯЖЭВІЧ.

Навіны навукі і тэхнікі

Паветраная абарона ў ПАЗШ

Генэральны штаб ПАЗШ выпрацаваў плян узмацненьня паветранай абароны найбольш важных гарадоў фэдэрацыі. Ажыцьцяўленьне гэтага пляну будзе праводзіцца на працягу 5 год. Першачатковыя выдаткі вылічаны ў 25 мільёнаў руб.

Асноўнай прыладай паветранай абароны амэрыканскіх гарадоў будзе трохцалёвая зэнітная гармата ўдасканаленага ўзору. Амэрыканцы сьцьвярджаюць, што гэта гармата б'е настолькі высока, што можа дастаць самалёт з самым высокім палётам.

Акрамя таго, амэрыканскія гарады будуць абараняцца ад нападаў з паветра групамі кулямётаў, мантыраваных па чатыры на адзін варшат. Кіраваньне і наводка такога чатырохрульнага кулямёту прадстаўляе нібы ня больш труднасьцяй, чым паліваньне якой-небудзь рэчы струменем вады на адлегласьці дзесятка мэтраў. Такая кулямётная ўстаноўка пасылае густы рой куль з хуткасьцю 5.000 стрэлаў у мінуту.

Нагляд за цэлямі будзе адбывацца пры дапамозе мэханічных «вачэй» і «вушэй», якія сочаць за самалётам на адлегласьці 10 клм.

Асноўная мэта пляну ўзмацненьня паветранай абароны заключаецца ў тым, каб абараніць ад паветраных атак важнейшыя прамысловыя і чыгуначныя цэнтры.

„Лёгкія" для падводнікаў

Пасьля доўгіх пошукаў і досьледаў у падводным флёце ПАЗШ зьявілася прылада, якая ставіць экіпажы субмарын амаль у анолькавыя ўмовы безапаснасьці з камандамі надводных баявых суднаў. Лейтэнантам Мамаенам скансструяваны тленны апарат. Чалавек без вадалазнага гарнітуру можна вытрымаць вялікі націск вады і хуткае зьмяненьне гэтага націску, г. зн. свабодна ўсплываць з вялікай глыбіні, на якую можа апусьціцца лодка, падбітая праціўнікам або пацярпеўшая аварыю.

Мамаен назваў гэту прыладу «лёгкімі». Апарат нагадвае сабой процігаз ранейшых узораў — невялікі мэталічны футляр, які можна павесіць на шыю. Ад футляра ідзе гумавая трубка, якая бярэцца ў рот.

Морскае ведамства прыступіла да абсталяваньня падводных лодак выратавальнымі камэрамі ў помпавай і кармавой частках і ўвяло ў інвэнтар такога судна па два «лёгкіх» Мамаена на кожнага чалавека з экіпажу. Усе падводнікі абавязаны праходзіць курс усплываньня на паверхню па спосабе Мамаена ня менш, чым з 100 фут. глыбіні.

ВЫМЕР ХУТКАСЬЦІ МАЛАНКІ

Хуткасьць, з якою пашыраецца разрад навальніцы, можа быць лёгка вымерана пры дапамозе асобнага апарату.

Апарат гэты прадстаўляе сабой фотакамэру з двума аб'ектывамі, якія хутка круцяцца і ўмацаваны на агульным дыску. Згодна атрыманых пры дапамозе гэтае прылады даных, час перакідваньня маланкі з хмары на зямлю складае прамежак часу ў 1/7000 сэкунды і ўсё зьявішча цягнецца ня больш 1/359 сэкунды.

Гэтай-жа прыладай вырашаецца старое спрэчнае пытаньне аб тым, ці ўдарае маланка зьверху або з зямлі ў хмару.

Фатаграфія паказвае, што маланка адначасова ўзьнікае ў хмары і з зямлі і абедзьве паловы злучаюцца ў сярэдзіне шляху. Усё разам гэта працягваецца 1/7000 сэкунды.

З прычыны таго, што фатаграфічная камэра мае два аб'ектывы, атрымліваюцца адразу два здымкі, якія адрозьніваюцца адзін ад аднаго, што дае магчымасьць вылічаць адлегласьць, на якой здарыўся разрад навальніцы.

Цьвёрдая вуглякіслата замест ільду

У Амэрыцы і на Захадзе ўсё больш пачынае спажывацца цьвёрдая вуглякіслата для захаваньня прадуктаў, якія хутка псуюцца. У продаж выпушчаны спэцыяльныя недарагія апараты, якія ў некалькі хвілін вырабляюць ляпёшкі цьвёрдай вуглякіслаты, тэмпэратурай у 100-120 град. ніжэй нуля па Фарангэйту. Цьвёрдая вуглякіслата мае наступныя перавагі перад ільдом: пры аднолькавым запасе холаду яна мае крыху меншы аб'ём, захоўваецца значна даўжэй чым лёд, растаючы не дае вадкасьці і ператвараецца цалкам у газ.

Паведамленьні

У суботу 31-8 а 5 г. увеч. у памяшк. акругкому МОПР'а адбудзецца францыя Фрунзаўскага РК МОПР'а, сумесна з францыяй рэўкамісіі.

Па прычыне важнасьці пытаньняў яўка членаў і кандыдатаў КП(б)Б Фрунзаўскага райкому МОПР'а абавязкова.

У панядзелак 2-IX а 7 г. увеч. у памяшканьні акругкому МОПР'а (Савецкая, 87) адбудзецца шырокі пленум Фрунзаўскага райкому МОПР'а, з удзелам актывістых Мопраўскіх вязеи.

Просьба да членаў райкому зьявіцца абавязкова, запрашаецца таксама і актыў.

Просьба да ячэек МОПР'а прыслаць у райком сьпісаи дэлегатаў на Фрунзаўскую канфэрэнцыю МОПР'а не пазьней 5 верасьня.

— ДОМ АСЬВЕТЫ. Сёньня — вечар, прысьвечаны МЮД.—Пачатак у 8 з пал. гадз. увеч. Уваход па разасланых білетах. Заўтра дзіцячы санішнік, пачатак у 1 г. дню.

— КЛЮБ НАВУК. ПРАЦАЎНІКОЎ сьля рамонту адчыняецца 1 верасьня.

Бібліятэка працуе з 6 да 9 гадзін увечары.

— БІБЛІЯТЭКА САЮЗУ СЕЛЬГАСЛЕСРАБОЧЫХ пры Цэнтральным Доме Спэцыялістых СЛГ АДЧЫНЕНА: па панядзелках, чацьвергах і суботах з 6 да 9 г. увеч. Абавязак чытачоў абмяніць цяздаць узятыя кнігі.

Мен. АКК даводзіць да ведама ўсіх членаў і канд. партыі, якія выяжджаюць на вучобу за межы БССР, што яны павінны 31 жніўня да 12-й г. дня зарэгістравацца у райкомах для праходжаньня чысткі партыі, якая адбудзецца 3 верасьня г. г.

Старшыня АКК ДАМБРОЎСКІ.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

ТЭАТР і КІНО

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР Музыкальная камэдыя і кам. опэра пад маст. кіраўн. Л. Г. МІРАЕВА.
Субота, 31 жніўня **„Подвязка Борджиа"** у 3-х дз. КРАЎСА
Білеты ў касе тэатру ад 12—2 і ад 5 г. ув. і ў раб. касе з 12—2 і ад 4—6 гадз. увеч. Пачатак а 8 з пал. гадз.

КІНО-ТЭАТР **„Культур"** — **НАЧНЫ РАМІЗЬНІК** мастацкі фільм у 6 части. Звыш праграмы: КІНО-ХРОНІКА Саўкіно № 41. Пачатак а 7 з пал. гадз. Каса—ад 6 г.
Кіно-сад **ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА** Савецкая, 71. — Мастацкі фільм паводле аповесьці І. Франка. **Барыслаў сьмяецца** Кіно-аповесьць у 7 част. Пачатак 1 с. а 9 г., 2 с.—10 г. 30 х. Каса ад 7 гадз.
Кіно **Інтэрнацыянал** — З прычыны вялікага посьпеху апошнія 3 дні: 30, 31 жніўня і 1 верасьня сусьветны комік МОНТЫ БЭНКС у лепшай камэдыі сэзону **ЛЯТУЧАЕ ШЧАСЬЦЕ** у 7 частках.
Кіно **Пралетары** — Па прычыне вялікага посьпеху 2-гі тыдзень Мастацкі фільм вытворч. БЕЛДЗЯРЖКІНО. **ДА ЗАЎТРА** Каса—ад 6 г.
1-шы дзіцячы кіно-тэатр **„Юны Піянэр"** — Новы цікавы фільм савецкай вытворчасьці **ТРОЕ** у 7 частках. Кіно адчынена штодня ад 2 гадз. дня. Пачатак 1-га сэансу а 3 г. 30 х., 2-га—а 5 г. Цана білета 10 к. Месцы нумараваныя.
Кіно **СПАРТАК** — З прычыны вялікага посьпеху апошнія шэсьць гастроляў **В. М. КАРАЛЕВАЙ** выканальніцы расійскіх народных і жартоўных песень. Зусім новы рэпэртуар. На экране грандыёзны замежны фільм драма **КЕНІГСМАРК** у 7 частках. Пачатак а 7 г. 15 м. Каса—ад 6 г.

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты адбываецца да 2 гадзіны дня

СКОРА **ЧЫКАГА** САЧЭЦЕ ЗА РЭКЛЯМАЙ.

У кіно „Культура" **ЧЫКАГА** САЧЭЦЕ ЗА РЭКЛЯМАЙ.

Пасьпяшэцеся падпісацца на ВЕРАСЕНЬ і далейшыя тэрміны НА ГАЗЭТУ **ЗЬВЯЗДА** орган ЦК і Мен. АК КП(б)Б.
УМОВЫ ПАДПІСКІ: на 1 м.—90к., на 3м.—2 р. 60к., на 6 м.—5 р., на 1 г.—9 р. 75 к.
«Зьвязда» дае сваім падпісчыкам дадаткамі на льготных умовах часопісы:

БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ	Рабоче-Крэсьтянскій КОРРЕСПОНДЕНТ	ОГОНЕК
1 м.—20 к. (замест 35 к.)	1 м.—25 к. (замест 30 к.)	1 м.—25 к. (замест 40 к.)

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА:
У Менску: Гал. к-рай газ. «Зьвязда», Савецкая, 63, ва ўпаўнаважанымі, адз. «Известия» і «Правда», Беларускім газетным бюро і газэтаносцамі.
Па акругах: Упаўнаважанымі газэты „Зьвязда", адз. „Известия" і „Правда", кіёскамі к-ва Друку і усімі паштова-тэлеграфнымі канторамі.

Кіно тэатр **„КУЛЬТУРА"**
У суботу, 31 жніўня роўна а 5 гадзіне ўвечары
СКЛІКАЕЦЦА
АРГАНІЗАЦЫЙНЫ СХОД ПАЛІТЫЧНА-МАСТАЦКАГА САВЕТУ,
ЯКІ АБРАНЫ НА КІНО-КАНФЭРЭНЦЫІ
Запрашаюцца наступныя таварышы:
Гальбрайх (культадзел ЦСПСБ), Матусаў (Белдзяржкіно), Бабіч (кіно «Культура»), Канакоцін (АПА ЦК КП(б)Б), Радкевіч (АПА АК КП(б)Б), Маслоўскі (АПА АК ЛКСМБ), Лук'янчык (паліт-кантроль), Гурскі (Галоўліт), Вайнер (гарбарня «Бальшавік»), Змачынскі (завод «Энэргія»), Дашчатаў (МБВ чыг.). Пашкевіч (будаўнікі), Гарабцоў (завод «Камунар»), Хамяноў (Эльвод), Гільман, Каромшчыкаў (харчавікі) Гурвіч (гарбары), Рубінштэйн (друкары), а таксама прадстаўнікі рэдакцый газэт «Зьвязда», «Рабочий», «Савецкая Беларусь», «Акцябр», «Чырв. Зьмена» і інш.
З прычыны важнасьці пытаньняў, просьба зьявіцца без спазьненьня.
Пасьля сходу адбудзецца грамадзкі прагляд кіно-карціны «ЖЫВЫ ТРУП».
УВАХОД ПА РАЗАСЛАНЫХ БІЛЕТАХ.
БЕЛДЗЯРЖКІНО.

ПОЛНЫЙ ПЕРЕВОРОТ в СЧЕТНОМ ТРУДЕ.
ЗАМЕНА ДОРОГОСТОЯЩИХ АРИФМОМЕТРОВ.
Счетный прибор „ЧЕРНЯК" превращает любые конторские счеты в АРИФМОМЕТР
Сч. пр. „ЧЕРНЯК" дает моментально девять готовых произведений любого числа. Абсолютная точность. Сч. пр. „ЧЕРНЯК" заменяет умножение сложением, а деление вычитанием. Готовых произведений. Скорость работы. Полное отсутствие умственного напряжения. Сч. пр. „ЧЕРНЯК" производит вычисление процентов, переводит метрические меры в русские и обратно. Дает готовые результаты при умножении дроби с однозначным знаменателем. Простота в работе. Бесшумность. Сч. пр. „ЧЕРНЯК" необходим бухгалтерам, счетоводам, таксировщикам,